№ 14 (324) 11 красавіка 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Міндоўга ставяць доўга



старонка 12

## Лукашэнка пачынае гонку ўзбраеньняў

Касьмічны спадарожнік і манэўры «Чыстае неба».

старонка 2

## Беларусы хочуць, каб было як у Нямеччыне

Статыстыка сымпатый да постсавецкіх і постсацыялістычных краінаў.

старонка 3

## Чаму Лёлік Ушкін любіць Садама

Упершыню ў «НН»: «Левым вокам».

старонка 2

# З апярэджаньнем клімату




IREX-PROMEDIA

**Урад — што той дачнік. Стаіць на сваіх прамерзлых сотках ды думае, што б такое пасадзіць сёлета, каб урадзіла суседзям на зайздрасьць. Гэтым разам пастанавілі зьдзівіць сьвет цукровымі буракамі, ячменем ды пшаніцай.**

**Пасяўная ўсё ніяк не пачнецца паспраўднаму: сонейка няма. Летась у гэты час засеялі амаль траціну палеткаў, сёлета — толькі 5%. Сабраць хочуць 6 млн. тонаў збожжа — па 27—30 цэнтнэраў з гектара. Але ці дазволіць клімат? Старонка 5.**

## Зазімак

**6—9 красавіка на ўсёй тэрыторыі Беларусі ішоў сьнег, месцамі моцны. Тэмпэратура паветра на большай частцы тэрыторыі краіны была блізкай да нуля, а на Гомельшчыне ў панядзелак ад поўдня было +6...+9°С (замест абяцаных -2...+3°С). Звычайна ж верхняй мяжой тэмпэратуры, пры якой выпадаюць цьвёрдыя ападкі, зьяўляецца +5°С. Нягледзячы на тое што да прыродных «падарункаў» мы апошнім часам прызвычаіліся, такой зьявы не было больш за дваццаць гадоў. Таўшчыня сьнежнага покрыва месцамі сягала 15 см. Надвор'е ў красавіку — старонка 12.**

# Праект засяленьня Курапатаў

**Будаваць катэджы ў Курапатах — занадта раскошна. Там трэба ставіць 5—7-павярховыя шматкватэрныя дамы, мяркуе галоўны архітэктар Менску Аляксандар Чадовіч.**

Летась ТДА «Вігэўрабуд» атрымала дазвол Менскага райвыканкаму на 10-гадовую арэнду тэрыторыі плошчай 26 га для будаўніцтва «жылога раёну катэджавай забудовы ў раёне ўрочышча Курапаты — Лагойскі тракт» (рашэньне райвыканкаму №1358 ад 31 жніўня 2002 г.). Агулам мяркуецца паставіць 160 катэджаў. За арэнду зямлі кампанія абавязалася пералічыць у бюджэт Менскага раёну 30% ад кошту аб'екту. Як прызнаўся генэральны дырэктар «Вігэўрабуду» Ўладзімер Асіповіч, гэта блізу мільярду рублёў (амаль 500 тысячаў даляраў).

Аднак будаўніцтва забараніў Дэпартамэнт па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. У часе праектаваньня пасёлку «Вігэўрабуд» забыўся на ахоўную зону вакол Курапатаў, якія лічацца гісторыка-культурнай каштоўнасьцю Беларусі. Як кажа намесьнік дырэктара Дэпартамэнту Ігар Чарняўскі, аблпракуратура на пачатку сакавіка загадала «Вігэўрабуду» спыніць усе працы, пакуль ня будуць зробленыя праекты ахоўнай зоны.

Свае прэтэнзіі да «катэджавага пасёлку» мае і галоўны архітэктар Менску Аляксандар Чадовіч: «Мы адмовілі ва ўзгадненьні праекту будаўніцтва катэджаў. Бо пад створаную інфраструктуру — гандлёвыя памяшканьні і транспартныя комплексы, якія разьвіваюцца побач, — шчыльнасьць насельніцтва мае быць вышэйшай. Занадта раскошна будзе ставіць там катэджы. Трэба будаваць 5—7-павярховыя шматкватэрныя дамы».

Калі «Вігэўрабуд» атрымаў папярэджаньне ад пракуратуры, рэкляма будаўніцтва пайшла пад іншай маркай. У менскай прэсе (газэта «Ва-банк») і ў Інтэрнэце (сайт www.tut.by) зьявіліся прапановы ўкладаць грошы ў катэджы пасёлку «Сонечны» пад Менскам, якія будуе беларуска-нямецкая фірма «Гарнбахер і Боль». Прыблізны кошт квадрату плошчы жытла там — 500 у.а.

**Працяг на старонцы 4.**

## Большасьць супраць трэцяга тэрміну

**61% апытаных менчукоў — супраць знаходжаньня аднае асобы на прэзыдэнцкай пасадзе больш за два тэрміны запар.** Такі вынік апытаньня, праведзенага сацыялягічнай службай «Люстра». 11% менчукоў выступаюць за адмену канстытуцыйнага абмежаваньня. У ліпені 2002 г. супраць выступала 59% апытаных, за — 16%.

# Лукашэнка пачынае гонку ўзбраеньняў

Рашэньне аб стварэньні касьмічнага спадарожніка і манэўрах «Чыстае неба» — адказ беларускай адміністрацыі на ірацкую вайну. Гэта старт гонкі ўзбраеньняў, перамога вайсковага лобі. Значыць, рыхтуемся абараняцца. Ад Усходу, ад Захаду — ад усіх? Скрозь, дзе разьвіваецца касьмічная індустрыя, яна мае вайсковы складнік.

Ініцыятары стварэньня беларускага спадарожніка разьлічваюць даць штуршок навукаёмістым вытворчасьцям, але для стварэньня касьмічнай прамысловасьці патрэбныя будуць велічэзныя інвэстыцыі, яшчэ больш трэба, каб падтрымліваць яе эфэктыўнай. Аддача інвэстыцый у малым, сярэднім бізнэсе большая, сродкі абяртаюцца хутчэй. Малыя краіны не дазваляюць сабе касьмічнае раскошы, бо ня маюць адпаведных ваенных задачаў. Свабодных грошай мала, і кожная вольная капейка ідзе ў вытворчасьць. (Свой спадарожнік — праект накшталт супэрвысокае тэлевежы ў Менску. Дзе яна, дарэчы?) Беларускі ўрад разьдзьмуў сацыяльныя праграмы за кошт зьмяншэньня інвэстыцый у вытворчасьць, што прывяло да зносу асноўных фондаў. Новая касьмічная ваенная праграма ляжа на эканоміку непасільным цяжарам.

**Мікола Бугай**

## Іван Карэнда: Камісары будуць

**Паводле чутак, на ўсіх прадпрыемствах з больш чым 500 работнікамі будзе ўведзеная пасада «камісара», адказнага за ідэалёгію. Начальнік галоўнага ідэалягічнага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзыдэнта Іван Карэнда пацьвердзіў нам абгрунтаванасьць такой інфармацыі: «Адпаведнае рашэньне пакуль не прынятае, але праца над ім вядзецца».**

ЦЫТАТА ТЫДНЯ



У раёне гэтага гораду (Шклова. — **Рэд.**) знаходзяцца самыя вялікія ў краіне масівы яловых насаджэньняў, якія зьяўляюцца сыравіннай базай для вытворчасьці газэтна-папяровай прадукцыі.

**Генадзь Навіцкі, у адказ на пытаньне, чаму менавіта ў Шклове паўстане прадпрыемства па вытворчасьці газэтнай паперы**

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## Краіна стамілася ад нестабільнасьці

Рубель працягвае абясцэньвацца, за даляр даюць ужо 2000 наяўных. Адначасова Міністэрства ўнутраных справаў паведаміла, што за тры месяцы гэтага году колькасьць злачынстваў вырасла на 22%. Да інфляцыі беларусы неяк звыклі. А вось з крыміналам — сапраўдны абвал. Мы на пятым месцы ў сьвеце па колькасьці зьняволеных на тысячу насельніцтва, і ўсё адно множацца рабункі, крадзяжы.

Дзьве гэтыя лічбы маюць тое супольнае, што і інфляцыя, і крыміналізацыя цесна зьвязаныя зь «беларускім эканамічным цудам». Інфляцыя, права сілы, адчужанасьць людзей ад уласнасьці, апека дзяржавы — нарожныя камяні беларускай эканамічнай мадэлі. А людзі жывуць ва ўмовах псыхалягічнае нестабільнасьці. Ні грошай не адкладзеш, ні ад хаты не ад'едзеш: абакрадуць, прападзе.

Апошнім часам не прынята гаварыць пра адказнасьць хвалёнай «вэртыкалі» за такі стан справаў. Між тым гэта яна ня ўмее, ня здольная кіраваць эфэктыўна. Таленавітых прафэсіяналаў сыстэма топіць толькі таму, што такія людзі «занадта самастойныя». Зьмена эканамічнай мадэлі і зацугляньне злачыннасьці «вэртыкалі» проста не па плячы.

**Андрэй Дынько**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Чаму я люблю Садама



Максымум праз пару тыдняў янкі замочаць Садама. Як левы, нічога ня маю супраць зьвяржэньня палітыка, які зьнішчыў кампартыю і шчаміў курдаў. Не разумею лёзунгу, зь якім мы — анархісты — выйшлі да амбасады ЗША: «No war». Вайна і левыя — справа складаная. Бакунін фармаваў валанцёраў на дапамогу Каліноўскаму, каб справакаваць Францыю атакаваць Расею, Троцкі пасылаў Будзённага ўзьнімаць Індыю, напярэдадні адкрыцьця другога фронту анархісты набылі танкі для Эйзэнхаўэра.

Усё залежыць ад таго, што за інтэрвэнцыя. У 1919 г. саветы спрабавалі штучна заснаваць у Іране «Гілянскую савецкую рэспубліку». Адным з «інтэрвэнтаў» быў паэт Хлебнікаў. Ён агітаваў за камунізм, забіваючы касяк. Такую інтэрвэнцыю вітаю, а бамбардзіровак мірных жыхароў я не падтрымліваю.

Чаму ў такім разе вітаю Садама?

Газуючы ў рамках фуршэту-сэмінару, прысьвечанага вайсковаму таленту Кім Чэн Іра, у амбасадзе КНДР у Маскве, сустрэў тав.Палішчука. У 90-м у Кіеве ён пад мянушкай «Камісар» узначальваў «Рэвалюцыйна-патрыятычны саюз «Промні Чучхэ»». «Промні» сьцябалі камуністаў, выкарыстоўваючы чучхейскую лексыку. Пасьля Палішчук, якому жарсьць да чучхеізму не замінала быць сябрам Руху, пайшоў ва ўладу, дэпутацтваваў, накасіў «бабуліну» на нейкай карупцыйнай дамове.

А потым на ўсё паклаў — на кар'еру, на Рух, на грошы. Сёньня, як у лепшыя часы, «разводзіць» Пхеньян: муціць сэмінар чучханутых у Парыжы.

«На які ляд табе, Камісар, чучха?» — спытаў я. «У нас, Лёлік, ва Ўкраіне тая ж чучха, толькі сумна», — адказаў Камісар і пачаў чытаць вар'яцкі даклад аб тым, як брашурка Кім Чэн Іра перапужала янкі, аж тыя спынілі вайсковыя вучэньні «Тым Сьпірыт».

Адыходзяць у мінулае экзатычныя сатрапы, якія елі сваіх апанэнтаў (Бакаса), забаранялі гарады (Пол Пот), складалі рэвалюцыйныя опэры (Кім Ір Сэн)...

Мярзотнікі яны былі сапраўдныя, аднак новы тып тыранаў яшчэ горшы.

Настае час шэрых дыктатараў. Цяпер дастаткова фармальна вызнаваць «правы чалавека», аддаваць даніну павагі Беламу дому, дасылаць «супрацьхімічны батальён» на чарговую акцыю кшталту «Свабоду Кубе». Пасьля можна спакойна катаваць дысыдэнтаў і прыгнятаць прэсу, як гэта робяць ва Ўзбэкістане, Казахстане, Пакістане...

Глябалізацыя на пэрыфэрыі капіталізму — перш за ўсё глябалізацыя культуры дыктатараў. Таму я ня згодзен з Андрэ Глюксаманам, які ў кнізе «Дастаеўскі на Мангэтане» піша, што бэн Ладэн — духоўны нашчадак д'ябла ў Дастаеўскага. Пятруша Верхавенскі ніколі б не дадумаўся, як Хусэйн, пераназваць даўно заняты марпехамі гарадок Ум-Каср у гонар сваіх шахідаў у Суіцыдаўск. Горад даўно б насіў імя «Бушбург».

**Лёлік Ушкін**

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Чаму я веру ў Буша



Што б ні казалі пацыфісты, няма ў сучасным сьвеце большага паскуды, чым той, чыю статую зрынулі ў сераду багдадцы. Мо дзе ў Афрыцы хіба, дзе жыцьцё ідзе паводле незразумелых нам законаў. Садам загубіў сотні тысяч жыцьцяў. Атакаваў Іран, Кувэйт, Ізраіль, курдаў. Няма другой такой краіны, якая б за апошнія 25 гадоў столькі нападала на суседзяў. Ён адзіны з кіраўнікоў дзяржаваў, хто за апошнюю чвэрць стагодзьдзя ўжыў хімічную зброю (унутры краіны і за мяжой). Ён адзін з чатырох ці пяці, што распрацоўвалі атамную бомбу.

Садам загубіў у дзясяткі разоў болей людзей, чым загінула ў цяперашняй вайне. У Халабджы — пяць тысяч жанчынаў і дзяцей замарыў за адзін дзень. У нас у Курапатах за чатыры гады паклалі 30 тысяч — і нашы дагэтуль ня можа адысьці ад жаху. А там за дзень — пяць тысяч.

Буш сапраўды не цырымоніцца з ворагамі заходняй цывілізацыі. Іх праблема, што яны абвесьцілі Захаду вайну. Не абвяшчалі б — ня сталі б ворагамі.

Добра выглядаюць цяперашнія пацыфісты ў белых пальчатках, якія чатыры гады таму пляскалі ў далоні Клінтану за Косава. Што, тады не разумелі сутнасьці амэрыканскай палітыкі? Ці мо цяпер не разумеюць нацыянальных інтарэсаў Беларусі? Ня бачаць далей за ўчора і заўтра.

Так, вайна — гэта бяда. Сэрца сьціскаецца ад бясьсільнага болю, калі бачыш скалечаных ірацкіх дзяцей. Але Хусэйн у любым разе загубіў бы болей, калі б застаўся пры ўладзе. Пакіньма рахункі сумленьня Богу, ня нам іх зьлічаць.

Амэрыка для Беларусі — сусед нашага суседа, Расеі. Так было пазаўчора і будзе пазаўтра. Войны мінуцца, а Беларусі ўсё адно прыйдзецца шукаць апоры ў Амэрыцы.

Вы кажаце, што вайна ня вырашыць праблемаў Іраку, што Амэрыка ня здолее дэмакратызаваць краіну? А вось яшчэ пабачым. Клінтан і Садама ня скінуў бы.

**Барыс Тумар**

# Занепакоенасьць Краўчанкам



Мыльная бурбалка лопнула. Спачатку недзяржаўныя СМІ заглынулі дэзу, пушчаную Інтэрфаксам з падачы ўладных структураў і голасна пацьверджаную прэсавым сакратаром МЗС Паўлам Латушкам. Пасьля камэнтатары мусілі прызнаць фальшывасьць інфармацыі: не прысьбечваў амбасадар Беларусі ў Японіі Пятро Краўчанка чэкавае кніжкі, не прыўлашчыў пячаткі беларускага пасольства і не хаваўся ў амэрыканскай амбасадзе...

Зрабіць з палітыка крымінальніка. Знаёмы прыём. Зь Лява Троцкага, Рыгора Зіноўева і Мікалая Бухарына «рабілі» ардынарных тэрарыстаў, шпіёнаў, дывэрсантаў. І народ верыў, а паэты пісалі рыфмаванкі кшталту «Мала іх павесіць...». Яшчэ адзін прыём — выціснуць патэнцыйнага «канкурэнта» за мяжу...

Улада занепакоеная П.Краўчанкам. На правакацыі ў 2001 г. ён не паддаўся. Гаспадарнікам ня быў (пры нашым гаспадарча-фінансавым заканадаўстве ды нашай судовай сыстэме можна пасадзіць кожнага зь іх праз паўгоду працы). Байка пра чэкавую кніжку і пячатку судовае пэрспэктывы ня мае і разьлічаная на алігафрэнаў у стадыі дэбільнасьці. Арганізаваць зьнікненьне не выпадае... На Захадзе ён не застаўся.

А намэнклятура ведае былога сакратара Менскага гаркаму КПБ Краўчанку. А падчас выбараў у Вярхоўны Савет XIII скліканьня галасаваць за Краўчанку грамадзянаў Маладэчна агітавалі знаныя дзеячы культуры зь Менску. А ён свой для гуманітарнікаў.

Краўчанкам занепакоеная ня толькі ўлада. Правадыры палітычных груповак — таксама. Па-першае, таму, што Краўчанка ведае рэальную цану амаль кожнаму зь іх. Многія з правадыроў рызыкуюць апынуцца па-за гульнёю, на лаўках заўзятараў, бо Краўчанка абапрэцца на інтэлектуалаў, людзей культуры і моладзь, а не на пяціразовых кандыдатаў-няўдачнікаў і грантасмокаў. Аматарам інтрыгі ня так лёгка будзе яго абставіць, як гэта ім удалося зрабіць зь Сямёнам Домашам, бо Краўчанка папросту не гуляцьме зь імі.

А тут Краўчанка раскрыў свае кантакты. І пачалася атака, абвінавачаньні ў тым, што ён, Краўчанка, у свой час абапёрся на дапамогу тых, хто дапамог Лукашэнку пахаваць дэмакратыю. Абвінаваўцы спрабуюць падвесьці нас да думкі, што ён, Краўчанка, — таксама магільшчык дэмакратыі.

Ды, дзякаваць Богу, ня ўсе мы хворыя на амнэзію, а таму памятаем, што дэмакратыю пахавалі Сямён Шарэцкі ды Валеры Ціхіня. Гэта яны, не ўпаўнаважаныя на тое, падпісалі сумнавядомае пагадненьне з Лукашэнкам. Ня ведаю, чым ім пагражалі Лукашэнка, Віктар Чарнамырдзін, Ягор Строеў ды Генадзь Селязьнёў, што ім паабяцалі, але яны прайгралі дэмакратыю.

...Зрабіўшы важную заяву, эксміністар можа ўзяць тайм-аўт. Хадзіць на выставы, у тэатры, кнігарні, майстэрні. Іншых палітыкаў туды на вяроўцы не зацягнеш. А Краўчанка ўмее размаўляць з інтэлігенцыяй. І інтэлігенцыя Пятра Краўчанку паважае.

**Анатоль Сідарэвіч**

# Беларусы хочуць, каб было як у немцаў

**Сацыялягічная служба агенцтва БелаПАН «Люстра» зладзіла на замову «НН» апытаньне жыхароў сталіцы пра іх стаўленьне да краінаў рэгіёну. Пытаньне гучала наступным чынам: «Якой з постсавецкіх і постсацыялістычных краінаў Вы сымпатызуеце?» Рэспандэнтам прапаноўвалася таксама адказаць, чаму ім падабаецца тая ці іншая краіна. Можна было называць некалькі дзяржаваў. Вось як разьмеркаваліся адказы.**

### Расея дарагая як памяць

Вось жа, 25% з 500 апытаных сымпатызуюць Расеі. Гэта малая лічба, як для краіны-саюзьніцы. Фактычна, працэнт сымпатый да ўсходняе суседкі апусьціўся да долі этнічных расейцаў у насельніцтве Менску. Параўнальна нізкія сымпатыі да Расеі тым больш нетрывалыя, што расейская эканоміка знаходзіцца на ўздыме, прэзыдэнт Пуцін б'е рэкорды асабістае папулярнасьці, а вайна ў Іраку мабілізуе ахоўныя рэакцыі прарасейскае часткі насельніцтва.

Прычыны сымпатыяў да Расеі эмацыйныя («бо падабаецца Пуцін», «бо доўга жылі разам») або ідэйнага характару («зь ёю нас зьвязвае гісторыя», «таму што браты — у трудзе і бядзе разам» — такія ж браты, як, між іншым, з палякамі і літоўцамі). Усё гэта робіць і без таго кволую для Расеі лічбу 25% зьнікомай.

### Моладзь глядзіць на Нямеччыну

Сярод сымпатызантаў Расеі 71% складаюць людзі ад 40 гадоў і старэйшыя (паводле сацыяльнага статусу гэта найчасьцей рабочыя, пэнсіянэры). А вось сярод сымпатыкаў Нямеччыны 78% людзей у веку 23—49 гадоў, вялікая доля інжынэрна-тэхнічных работнікаў, студэнтаў.

Нямеччына, дарма што трапіла ў шэраг постсацыялістычных паводле фармальнай прыкметы, была адзінай краінай «сапраўднага Захаду» ў сьпісе. Сымпатыі да Нямеччыны збольшага маюць эканамічную аснову: «там добра жывуць», «там дбаюць пра людзей». Нямеччыну часта называюць у адным пачку з Польшчай і Чэхіяй.

### Польшча — малы тыгр рэформаў

Кожны шосты жыхар сталіцы сымпатызуе Польшчы. Сярод паляафілаў пераважаюць жанчыны (58% проці, напрыклад, 46% сярод прыхільнікаў Расеі). Моладзь 18—39 гадоў складае 69% сымпатыкаў. Вялікі працэнт прадпрымальнікаў, студэнтаў. Гэты паказьнік уражвае, калі ўлічыць ступень антыпатыі палякаў да Беларусі, што саступае толькі нэгатыўнаму стаўленьню да Украіны й Расеі.

## Сымпатыі да постсацыялістычных і постсавецкіх краінаў

### Чэхія — гістарычны саюз

Вітаўт, Скарына, Геніюш, Швэйк, Гавал, Карлаў унівэрсытэт і нават піва не вытлумачваюць усяго фэномэну любові да Чэхіі — адзінай малой краіны, што не мяжуе зь Беларусяй, але цешыцца вялізнай сымпатыяй менчукоў: моладзі, людзей з вышэйшай адукацыяй, а таксама... хатніх гаспадыняў. Сярод найбольш частых аргумэнтаў — «у іх ёсьць чаму павучыцца», «там людзі шчасьлівыя, жывуць нармальна».

Два простыя аўтобусныя рэйсы зь Менску ў Прагу штодзень, цягнік, самалёт, пасольства, асяродак палітуцекачаў — заканамерныя праявы несумненнай цягі беларусаў да чэхаў.

### Бывайце, братушкі!

Беларусы пазбываюцца расейскага погляду на сьвет. Ні Баўгарыю, ні Сэрбію — краіны, якія маюць гістарычныя сувязі з Расеяй, — жыхары сталіцы не вылучаюць з агульнае масы «невядомых Балканаў», што застаюцца ў цэлым чужэйшымі, чым нават азіяцкія рэспублікі Садружнасьці.

### Фіялетава, сіне з зорачкамі...

Амаль 30% жыхароў сталіцы ніколі не задумваліся над гэтым пытаньнем, яшчэ 12% не сымпатызуюць нікому, а 5,8% выбралі дыпляматычны варыянт «Усе пералічаныя краіны». Яны складаюць тую палову, якую не цікавяць працэсы за межамі Беларусі.

Тыя ж, хто з сымпатыямі вызначыўся, называлі ў сярэднім 2,46 краіны. Да постсацыялістычных краінаў Цэнтральнай Эўропы менчукі ставяцца з большай сымпатыяй, чым да краінаў СНД. Першым аддаюць перавагу каля трацiны, другім — каля чвэрткі апытаных.

Вынікі апытаньня ўскосна пацьвярджаюць тэндэнцыю росту папулярнасьці эўраінтэграцыйных ідэяў, выяўленую сацыёлягамі летась. Беларусы больш ня хочуць, каб было як раней. Па-за сумневам, палітычныя наступствы гэтага развароту ў бок Эўропы не забавяць адбіцца на палітычнай рыторыцы лукашэнкаўцаў і дэмапазыцыі на парлямэнцкіх і асабліва прэзыдэнцкіх выбарах-2006.

**Мікола Бугай**

| Краіна | Колькасьць прыхільнікаў |
|---|---|
| Расея | 25,1% |
| Нямеччына | 21,4% |
| Польшча | 16,2% |
| Украіна, Чэхія | 11% |
| Літва | 8,2% |
| Латвія | 6,6% |
| Эстонія | 6,2% |
| Грузія, Малдова | 3,6% |
| Вугоршчына | 3,4% |
| Казахстан | 2,8% |
| Арменія | 2,4% |
| Туркмэнія | 2,0% |
| Азэрбайджан, Таджыкістан, Узбэкістан | 1,8% |
| Кіргізія, Славенія | 1,6% |
| Сэрбія | 1,2% |
| Харватыя | 1,0% |
| Румынія | 0,8% |
| Баўгарыя, Чарнагорыя | 0,2% |
| Боснія і Герцагавіна | 0% |
| цяжка адказаць | 29,1% |
| ніводнай не сімпатызую | 12,4% |
| усе пералічаныя краіны | 5,8% |

АБМЕЖАВАНЬНЕ ПІЎНОГА ІМПАРТУ

# Ці піва заяц зварыць густа?

Піва — самы капрызны з алькагольных напояў. Яно самае смачнае, калі жывое-непастэрызаванае і нефільтраванае, без кансэрвантаў, з рэшткамі жывых дрожджаў. Таму піва рэдка возяць далёка. Сярэдні бэльгійскі ці канадзкі спажывец на 90% наталяе смагу півам, звараным у родным горадзе. Яшчэ 3-4 гады таму так было і ў Беларусі. Цяпер жа беларускае піва выціскаецца расейскім прадуктам. Наша піва трымаецца ў асноўным дзякуючы нізкай цане — мала хто лічыцца яго самым смачным.

Дый адкуль узяцца ў нас якаснаму піву? Беларускі ячмень найбольш прыдатны на фураж, бо зьмяшчае шмат бялку, а для піваварства патрэбны ячмень з высокім утрыманьнем цукроў. Калгасы даўно развучыліся такі вырошчваць. Півавары ж блытаюць горкія і араматычныя гатункі хмелю ды купляюць любы, які трапіцца, часам ня грэбуючы пратэрмінаваным. Хмеляводзтва, экспартная галіна за часамі Вялікага Княства, у 1985-м зьнішчанае дарэшты. Сёньня на ўсю Беларусь засталіся два хмельнікі, якія спрабуюць аднавіць энтузіясты-іншаземцы.

Але дрэнныя часы, здаецца, мінаюць. Нас чакае бум інвэстыцый і мора тутэйшага піва. Капіталісты з усяго сьвету сталі ў чаргу па ганаровае права рэканструяваць айчынныя бровары. Якім жа будзе новае беларускае піва?

Ёсьць некалькі варыянтаў разьвіцьця падзеяў. Новыя гаспадары могуць «пагнаць вал» — масава вырабляць сьветлыя легеры пльзеньскага кшталту. А добра было б, каб зьявілася ў нас і белае (пшанічнае) піва, і eis bier, і іншыя спэцыяльныя гатункі, якія ўжо масава вараць нашыя суседзі.

Піўны рынак могуць падзяліць між сабою некалькі бровараў-гігантаў. А варта, каб засталося месца і для ініцыятыўных мікрабровараў, здольных прапанаваць спажыўцу штосьці адмысловае.

Варта, бо піва — частка беларускай культуры. На сучасным рынку прадаецца і спажываецца ня столькі пэўнае спалучэньне вугляводаў, фарбавальнікаў, фэрмэнтаў і кансэрвантаў, якія складаюць той ці іншы прадукт, колькі ўяўленьне пра гэты прадукт, сыстэма вобразаў, якую ён выклікае, ягоная легенда. Тут беларускім піваварам ёсьць да чаго апэляваць.

Спажываньне піва ў Беларусі складае каля 20 літраў на чалавека штогод. Гэтая лічба нязьменная з XVIII ст. Дык чаму ж не адрадзіцца «гарохаваму», «ярычнаму», «расходнаму», «марцоваму», «дубальтоваму», «граматцы», «вязынскаму портэру»? «Вехам на піва» — тычкам з пукамі саломы, прымацаванымі да даху корчмаў, што здалёк паведамлялі падарожным: піва ёсьць! Піўным фэстам — з паўгарцавымі шкляніцамі на тры абручыкі, з бочкамі піва ў комінах? Беларускае піва — гэта не каламутная вадкасьць невядомага паходжаньня, а напой годных людзей. Веру, што хутка зноў будзе так.

**Алесь Белы**

**Падпіска**

Нагадваем, што падпіскаю газэта абыходзіцца таньней.
Падпісны індэкс **63125**.
Цана падпіскі на месяц – **2043** рублі.
Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».
**Дык падпісвайся!**




**На выставе «Бістро: піва, віно, напоі» 8 красавіка ў Менску піва і іншыя напоі прапаноўвалі ўсім.**

# Звалілі Садама

**9 красавіка ўзброеныя сілы кааліцыі ўзялі пад кантроль цэнтар сталіцы Іраку. На цэнтральнай плошчы Багдаду, што носіць назву Тахрыр (Свабода), сотня іракцаў разам з дапамогаю амэрыканскіх жаўнераў зваліла статую дыктатара, пастаўленую летась з нагоды ягонага 65-годзьдзя. Падзея трансьлявалася ў жывым этэры CNN.**



REUTERS

## Новая ініцыятыва Шорыкава

**Магілёўскі мэр-рэфарматар Шорыкаў вырашыў аб'яднаць тры гарадзкія раёны ў два новыя.** Замест Кастрычніцкага, Цэнтральнага ды Ленінскага створаць Задняпроўскі ды Цэнтральны (або Машэкаўскі) раёны. Аблсавет падтрымаў прапанову. Гэта будзе першы выпадак дэкамунізацыі раённых назваў у Беларусі.

## «Краскі» пад сьледзтвам

**Супраць удзельнікаў поп-гурту «Краскі» ўзбуджаная крымінальная справа паводле артыкулу 209** (махлярства). Справу ўзбудзіў Менскі аддзел унутраных справаў на транспарце. Музыкі лічаць, што яна сфабрыкаваная, а прычынай мог стацца пірацкі дыск «Красак», выяўлены імі ў краме «Дыскаманія», што належыць УП «ДарОрс». Міністар унутраных спраў Уладзімер Навумаў асабіста кантралюе ход справы. Сьледчыя ад камэнтароў адмаўляюцца.

## Поўнае амаладжэньне

**Старшынём маладачанскай суполкі Партыі БНФ абраны 20-гадовы Ян Лагвіновіч.** Ён раней кіраваў філіяй незарэгістраванага «Маладога фронту». Вучыцца ў Менску. Яго намесьнікам абраны 23-гадовы Руслан Згурскі.

## Яшчэ адна міліцыя

**Начальнікам Дзяржінспэкцыі аховы жывёльнага і расьліннага сьвету пры прэзыдэнце прызначаны генэрал-маёр запасу Алег Яцкевіч,** былы намесьнік міністра абароны. Інспэкцыя мусіць выконваць функцыі экалягічнай міліцыі.

**СМ; БелаПАН**

# Кампэнсацыя за маёнткі на «Крэсах»

**Кракаўскі суд пастанавіў сплаціць Эдварду Р. і ягонай сястры 600 тыс. злотых (каля 294 млн. рублёў) кампэнсацыі за страчаны пасьля вайны маёнтак на тэрыторыі сёньняшняй Украіны. На чарзе — яшчэ колькі дзясяткаў падобных справаў.**

Былыя землеўладальнікі абапіраліся на пагадненьне між Польскім камітэтам нацыянальнага вызваленьня і УССР, што тычыцца рэпатрыяцыі палякаў з Усходу. Гэткія самыя дакумэнты ў свой час былі падпісаныя зь Беларусяй і Літвой. Паводле аднаго з пунктаў дамовы, Польская дзяржава мае кампэнсаваць рэпатрыянтам страту пакінутых маёнткаў. Але ўлады ня ўнесьлі гэтага міжнароднага пагадненьня ў Звод законаў. І, адпаведна, кампэнсацыя не выплачвалася.

Польскі МЗС пратэставаў супраць рашэньня суду, спасылаючыся на пагадненьне 1952 г. між Польшчай і СССР, паводле якога ўсе маёмасныя справы такога кшталту былі прызнаныя цалкам вырашанымі. Пратэст быў адхілены.

Гэткі вырак — другі за апошнія тыдні. Нядаўна іншая кракаўская сям'я адсудзіла такім самым чынам 2 млн. злотых (1 млрд. 880 млн. рублёў). Яны дамагліся кампэнсацыі за пакінуты ў колішнім Віленскім ваяводзтве 30-гектаравы фальварак і маёнтак з млынам ды вялікім домам у былым Цярнопальскім ваяводзтве. Працэс цягнуўся два гады.

Прадстаўнікі малапольскага ваяводы, які рэпрэзэнтаваў дзяржаву на абодвух працэсах, падалі апэляцыю. Дагэтуль усе такія справы вырашаліся на карысьць дзяржавы. Некаторыя «красавякі» нават зьярталіся ў Трыбунал па правох чалавека ў Страсбург. У Польшчы жыве 70—80 тыс. асобаў, што страцілі маёнткі на Ўсходзе. Дзяржава вінна ім дзесьці 7—9 млрд. злотых.

**МХ**

## ХРОНІКА ЎЦІСКУ

26 сакавіка непаўналетні Антон Кішкурна, сын асуджанага ўдзельніка сьвяткаваньня Дня Волі Ўладзімера Кішкурны, быў затрыманы і зьбіты каля будынку Савецкага суду Менску. Хлопец чакаў завяршэньня суду над бацькам у аўтамабілі, на якім была бела-чырвона-белая налепка. Міліцыянты, выцягваючы А.Кішкурну з аўтамабіля, зламалі яму руку, што паказала і мэдычнае асьведчаньне. На хлопца таксама быў складзены пратакол за непадпарадкаваньне законным патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі. 27 сакавіка ў Горадні на 7 сутак арышту быў асуджаны намесьнік старшыні гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ Мікола Воран за тое, што 23 сакавіка ўдзельнічаў у сьвяткаваньні Дня Волі. 31 сакавіка ў Віцебску былі затрыманыя сябры КХП-БНФ Уладзімер Плешчанка і Аляксандар Салаўян, якія выйшлі на пікет у падтрымку амэрыканскай апэрацыі ў Іраку. Віцебскаму апазыцыянэру Барысу Хамайду 1 красавіка было абвешчанае судовае папярэджаньне за плякат «Не галасуй, бо загалосіш!», зь якім той выходзіў на пікеты падчас выбарчае кампаніі. Старшыня страйкаму прадпрымальнікаў Беларусі Валер Леванеўскі і ягоны сын Уладзімер былі затрыманыя 1 красавіка каля Дому ўраду ў Менску. 2 красавіка В.Леванеўскі быў асуджаны на 15 сутак арышту за ўдзел у маршы «За лепшае жыцьцё!». 3 красавіка ў Менску падчас акцыі «Далоў тыранаў!» былі затрыманыя сябры незарэгістраванага руху «Зубр» Тацяна Ялавая, Дзяніс Чыкалёў, Любоў Кучынская, Сяргей Пейпаловіч, Аляксандар Булатаў, Уладзімер Кобец, Леанід Навіцкі. Затрыманыя тамсама Хведар Паўлючэнка і Аляксандар Атрошчанкаў былі адпушчаныя праз 2 гадзіны пасьля прад'яўленьня журналісцкіх пасьведчаньняў. 3 красавіка ў Барысаве мелася адбыцца сустрэча гараджанаў з адміністрацыяй і дэпутатамі гарсавету, але ніхто з начальства не прыйшоў. Тады гараджане ўтварылі камітэт грамадзкага самакіраваньня, а старшыню грамадзкага аб'яднаньня «Скрыжаваньне» Сержука Салаша абралі ягоным старшынём. Міліцыя склала пратакол на С.Салаша за арганізацыю несанкцыяванага мітынгу. 4 красавіка ў Цэнтральным судзе Менску была асуджаная «за паклёп на прэзыдэнта» на 2 гады пазбаўленьня волі (з адтэрміноўкай на 2 гады) Аксана Новікава. 6 красавіка падчас акцыі «Ланцуг неабыякавых людзей» былі затрыманыя сябры Аб'яднанай грамадзянскай партыі Сяргей Лапуста і Андрэй Козел. Напярэдадні, 5 красавіка, у Менску невядомыя зьбілі Аляксандра Карпенку, малодшага брата Генадзя Карпенкі, памяці якога прысьвячаўся «Ланцуг неабыякавых людзей». У Віцебску 6 красавіка былі затрыманыя ўдзельнікі пікету памяці Г.Карпенкі Сяргей Васенка, Алеся Гаголка, Іван Цераш, Генадзь Любаўскі, Яўген Колычаў — на ўсіх склалі пратаколы. 8 красавіка камісія па справах непаўналетніх пры Барысаўскім гарвыканкаме прыняла рашэньне аштрафаваць бацькоў 9-клясьніка Зьмітра Шматка на 15.000 рублёў: сябра незарэгістраванага руху «Зубр» быў затрыманы міліцыянтамі 5 сакавіка пры раздачы ўлётак з пратэстам супраць сацыяльнай палітыкі ўлады.

**АШ**

# Праект засяленьня Курапатаў

Працяг са старонкі 1.

Беларускім партнэрам «Гарнбахеру» зьяўляецца турыстычная кампанія «Сакуб». Во як характарызуецца нямецкі кампаньён на яе інтэрнэт-сайце: «Кампанія ўжо шмат гадоў працуе на будаўнічым рынку Нямеччыны і за гэты час пасьпела добра зарэкамэндаваць сябе».

Дзіўна, аднак, што будаўнічая фірма «Hornbacher+Boll» ня мае сваёй інтэрнэт-старонкі ды не сустракаецца ў пошукавых сэрвэрах. І ў такую эфэмэрыду прапануюць укладаць немалыя грошы: фірма прапануе ўчасткі па 8, 10, 15 і 20 сотак. Кошт соткі — 1500 у.а.

І.Чарняўскага гэтая рэкляма зьдзівіла: «Мы вынесьлі папярэджаньне «Віцэўрабуду», а тут зьявілася зусім іншая фірма». А.Чадовіч зазначае, што рэклямныя публікацыі наконт забудовы тэрыторыі незаконныя.

Зрэшты, ані ў А.Чадовіча, ані ў «Сакубу» маральных згрызотаў будаўніцтва каля Курапатаў не выклікае. Дарма што пасьля пабудовы жылога пасёлку ўрочышча, якое й сёньня ня ў лепшым стане, мае шанцы канчаткова ператварыцца ў «шашлычню». Без гаспадара ды без ахоўнае зоны 30-гектарная тэрыторыя Курапацкага лесу будзе дарэшты спляжаная аматарамі «адпачынку на сьвежым паветры». Тым больш дзіўна гучаць аргумэнты А.Чадовіча: «Калі кажуць, што да гэтых 30 га трэба яшчэ сотню гектараў зрабіць ахоўнай зонай, дык гэта абсалютна неабгрунтавана і нерэальна. Жыцьцё ёсьць жыцьцё». Ён зазначае, што «старыя могілкі заўжды ідуць пад знос».

Аднак давайце паспрабуем сказаць заміж «Курапаты» — «Хатынь». Што, і тут жыцьцё ёсьць жыцьцё?

Вырашаць лёс Курапатаў хутка будзе ўжо не раённы, а Менскі гарадзкі савет. Тэрыторыя перададзеная яму. Раней у гарадзкой юрысдыкцыі была толькі невялікая частка лесу да кальцавой дарогі. Галоўны архітэктар кажа, што працэс перадачы гораду гэтай тэрыторыі ўжо ідзе. «Гэта трэба, каб, па-першае, ствараць юрыдычную асобу, якая будзе абслугоўваць тэрыторыю. Па-другое, каб у будучым сфармаваць бюджэт мэмарыялу і нешта зь ім зрабіць. Бо сёньня мы бачым і вандалізм, і непаважлівае стаўленьне да гэтага журботнага месца», — гаворыць А.Чадовіч.

Аб'яднаньне Курапатаў пад «адной страхой» дазволіць іхным абаронцам зь меншымі высілкамі вырашаць канкрэтныя пытаньні, зьвязаныя з мэмарыялам. Пішу «абаронцам», бо сёньня Курапатам яшчэ далёка да ператварэньня ў просты мэмарыял — гэты лес па-ранейшаму застаецца месцам змаганьня. Праўда, пакуль для абароны Курапатаў ня трэба зноў выходзіць пад бульдозэры. Пакуль яшчэ ёсьць шанец на мірную абарону. Затое, як паказвае досьвед 2001—2002 г., калі пойдуць бульдозэры, зрабіць нешта будзе ўжо позна.

**Аркадзь Шанскі**




1. Вуліца Мірашнічэнкі
2. Кальцавая аўтадарога
3. Мікрараён «Зялёны луг-6»
4. Гандлёва-выставачны цэнтар «Экспабел»
5. Прыпынак грамадзкага транспарту
6. Аўтазаправачная станцыя
7. Катэджны пасёлак «Сонечны»
8. Гасьцявая аўтастаянка
9. Гандлёвы цэнтар
10. Царква
11. Курапаты.

# З апярэджаньнем клімату


IREX-PROMEDIA

Працяг са старонкі 1.

## Свой цукар

Плачце, жыхары «Выспы Свабоды», — Беларусь мае намер абысьціся бяз вашага трысьняговага цукру. Сёлета паабяцалі цалкам забясьпечыць цукровыя заводы айчыннай сыравінай. Цукровымі буракамі засеюць 77 тыс. га супраць 50,4 тыс. леташніх. Сабраць маюць 3 млн. тонаў буракоў — амаль у два разы больш, чым летась. Вырошчваць іх будуць на Берасьцейшчыне, Меншчыне ды Гарадзеншчыне. Ураджайнасьць мусіць скласьці 370 цэнтнэраў з гектару, у самых цёплых раёнах — да 400 цэнтнэраў.

Цягам апошніх 5 год у краіне выраблялі штогод 510 тыс. тонаў цукру. З уласных буракоў — толькі 160 тыс. тонаў, астатняе — з кубінскага цукру-сырцу. Каб цалкам забясьпечыць краіну ўласным цукрам, давядзецца перапрацоўваць да 26 тыс. т буракоў у суткі. Гэткай магутнасьці заводы здолеюць дасягнуць толькі налета.

Каб зьдзейсьніць «салодкія мроі», трэба адшукаць 100,3 млрд. рублёў. Цукровым заводам будуць даваць беспрацэнтныя крэдыты на рэканструкцыю. Найбольш — 25,5 млрд. рублёў — атрымае Жабінкаўскі цукровы завод.

## Свой ячмень

«Каб піва было ды па вусах цякло» — вось новая палітыка ўраду адносна броварнай справы. Цягам двух гадоў вырашылі рэканструяваць 17 з 30 бровараў, у першую чаргу «Лідзкі», «Аліварыю» ды «Дзеднава». Бюджэт на гэта грошай не дае — давядзецца броварам браць крэдыты ці шукаць інвэстараў.

Калі летась у краіне зварылі 21,8 млн. дэкалітраў бурштынавага напою, дык праз два гады мусяць выдаваць 45,5 млн. дэкалітраў. Штогадовы экспарт піва прэзыдэнт загадаў павялічыць утрая — да 11,4 млн. дэкалітраў у 2005 г. Значыцца, давядзецца падвысіць вытворчасьць соладу з 42,3 тыс. тонаў летась да 90,4 тыс. тонаў у 2005 г. Пакуль што солад вязуць, у асноўным, з-за мяжы. Таму цягам двух гадоў выращшылі павялічыць пасевы піўнога ячменю з 27 да 66 тыс. гектараў, каб атрымліваць свой солад.

Цяпер у нас ячменю жнуць 22,3 цэнтнэра з гектару. Спэцыялісты зь Міністэрства сельскай гаспадаркі жадаюць набыць высокапрадукцыйнае селекцыйнае збожжа і атрымліваць да 27 цэнтнэраў з гектару. Каштаваць праграма будзе 124,2 млн. даляраў, акупіцца мае за 4,5 году.

## Больш бульбы, менш збожжа

Затое бульбу аддалі на водкуп прыватнікам. У 1999 г. сабралі 1200 тыс. тонаў «другога хлебу», летась — толькі 588 тыс. тонаў. На першы погляд, бульбы на рынках хапае. Аднак прадпрыемствам, што бульбу перарабляюць, яе ўжо замала. Перапрацоўчыя прадпрыемствы летась нарыхтавалі толькі 40% ад патрэбы. Таму насенку абновяць, каб атрымліваць большы ўраджай. Дзяржава пастанавіла пашырыць пасевы гародніны.

Яшчэ адна тэндэнцыя сёлетняй пасяўной — пасевы жыта зьменшацца на 30%. Замест яго пасеюць пшаніцу. У Міністэрстве сельскай гаспадаркі кажуць, што гэта «зьвязана з арыентацыяй на патрэбы сусьветнага сельскагаспадарчага рынку».

Посьпех новых сельскагаспадарчых праектаў будзе залежаць ад капрызаў надвор'я. Утрыманьне цукру ў цукровых бураках, якасьць соладавага ячменю, зборы пшаніцы і гародніны моцна залежаць ад цеплыні лета. У савецкі час гэтыя культуры вырошчвалі ў цяплейшых раёнах СССР. Ня выключана, што новым праектам наканаваны лёс кукурузы. Клімат у Беларусі сьцяплее, але яшчэ не настолькі, каб мяняць сельскагаспадарчую спэцыялізацыю.

**Алесь Кудрыцкі**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

### «Хімвалакно» застанецца дзяржаве

**Акцыянаваньне сьветлагорскага «Хімвалакна» адкладзенае.** Прадпрыемства мае атрымаць кувэйцкі крэдыт у памеры 16,5 млн. даляраў на рэканструкцыю вытворчасьці поліэфірных тэкстыльных нітак, а ў кантракце ёсьць умова: «Хімвалакно» ня мусіць зьмяняць форму ўласнасьці. Падпісаны той кантракт на два гады.

### Падводныя гадзіньнікі

**Менскі гадзіньнікавы завод пачаў рабіць гермэтычныя гадзіньнікі, што вытрымліваюць ціск на глыбіні да 30 м.** Гермэтычнасьць забясьпечваецца выкарыстаньнем сапфіравага шкла. Каштаваць такі гадзіньнік будзе 30—50 тыс. рублёў. Завод зьбіраецца рабіць тысячу штук кожны месяц.

### «Белтрансгаз» акцыянавалі

**«Газпрам» задаволены: Менгарвыканкам афіцыйна зарэгістраваў ААТ «Белтрансгаз».** Аднайменнае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства перастала існаваць. Неўзабаве «Белтрансгаз» павінен перайсьці пад кантроль «Газпраму» ў адплату за беларускія газавыя запазычанасьці.

### «Белтэлекам» на продаж

**Прыватызацыю «Белтэлекаму» пачнуць у 2007 г.** Беларусь жадае ўвайсьці ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю. Для гэтага трэба рэфармаваць прадпрыемствы-манапалісты, у тым ліку «Белтэлекам».

### Месяц без расейскага піва

**«Балтыка» і «Афанасій» спынілі імпарт піва ў Беларусь.** 1 красавіка ўвялі новы парадак разьмяшчэньня акцызнай маркі на таварнай накладной. Да таго ж, увозіць піва будзе можна толькі праз склады, што ўваходзяць у адмысловы пералік. Аднак на тых складах няма ні новых акцызных марак, ні інструкцый, як іх ужываць. Зьявяцца яны не раней за канец красавіка.

### Дзе будуць гандлёвыя цэнтры

**Менгарвыканкам пускае «з малатка» два ўчасткі пад пабудову гандлёвых цэнтраў.** Першы знаходзіцца на скрыжаваньні Партызанскага праспэкту і вуліцы Бехцерава, другі — вуліцаў Талстоя і Дружнай. Галоўная ўмова, якую выставілі патэнцыйным інвэстарам, — пералічваць 1% ад прыбытку ў гарадзкі бюджэт.

### Прычэпы абклалі мытам

**Міністэрства транспарту і камунікацыяў вінаваціць Дзяржаўны мытны камітэт у тым, што ён дыскрымінуе беларускіх перавозчыкаў.** 28 сакавіка Камітэт пастанавіў, што мытам мусяць абкладацца ня толькі тавары, але і прычэпы ды паўпрычэпы, на якіх тыя тавары вязуць. Мінтранс лічыць, што гэтае рашэньне супярэчыць Мытнаму кодэксу, і баіцца развалу сыстэмы міжнародных грузаперавозак.

### Бягучы радок у тралейбусах

**Пасажыры менскіх тралейбусаў змогуць бавіць час, чытаючы электронны радок.** Гэтае прыстасаваньне ўжо паставілі ў салёнах 5 машынаў. Каштуе яно 800 тыс. рублёў. Акрамя назваў прыпынкаў ды вытрымак з правілаў паводзінаў у транспарце, у радку будуць даваць рэкляму.

**АК**

# Васіль Лявонаў: «Дзе тыя цэнтнэры?»

**У дзень выхаду гэтага нумару «НН» мусіла адбыцца сэлектарная нарада. Аднак, як паведамілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі, ні ў чацьвер, ні ў пятніцу яе ня будзе. Нечаканы сьнег дэактуалізаваў галоўнае пытаньне нарады — ход пасяўной. У інтэрвію «НН» погляд апазыцыі на шляхі разьвіцьця сельскай гаспадаркі прэзэнтуе Васіль Лявонаў, былы міністар сельскай гаспадаркі краіны.**


IREX-PROMEDIA

**«НН»: Калі б на прэзыдэнцкіх выбарах перамог Ганчарык, якім чынам яго каманда фармавала б адносіны ўласнасьці ў вёсцы?**

**Васіль Лявонаў:** Усё, што на сёньня яшчэ не праелі, — аддаць сялянам. Трэба было аддаць ва ўласнасьць зямлю, бо больш аддаваць фактычна няма чаго.

**«НН»: Ці варта захаваць калгасы як форму ўласнасьці?**

**В.Л.:** Калгас можна захаваць цалкам, можна — разьбіць на драбнейшыя гаспадаркі. А хто хоча — няхай выходзіць зь яго і бярэ зямлю. Але мы ня маем ніякага права казаць: вось мы табе далі зямлю, але ты застанешся ў калгасе. Зямля ва ўласнасьці — гэта свабода.

**«НН»: Што рабіць з буйнымі жывёлагадоўчымі комплексамі?**

**В.Л.:** Таксама аддаць сялянам. Найлепшы варыянт — арэнда з правам выкупу.

**«НН»: Як вы ставіцеся да магчымасьці прыходу інвэстыцыяў з Расеі? На Пружаншчыне ўжо створаная «Белавеская харчовая кампанія» з удзелам расейскага капіталу.**

**В.Л.:** Тое, што ёсьць на Пружаншчыне, — гэта, так бы мовіць, асобныя зьявы. А ўвогуле інвэстыцыі сюды ня прыйдуць, бо няма свабоды.

**«НН»: У апошнія свае гады савецкая ўлада пачала будаваць заводы, якія мусілі вырабляць бялкова-вітамінныя дабаўкі. Што зь імі рабіць?**

**В.Л.:** Гадоў пяць-шэсьць таму іх яшчэ можна было ўратаваць. Была ў свой час вельмі цікавая і выгадная распрацоўка БДУ. Гутарка ішла пра тое, каб вырабляць бялкі ня з нафты, а з жыта ды іншых багатых на крухмал прадуктаў. Бялок можна было б нават прадаваць за кардон, быў на яго попыт. Цяпер тыя заводы разваліліся, ужо няма аб чым весьці гаворку.

**«НН»: Нядаўна пастанавілі зьмяніць спэцыялізацыю агракомплексу ў чарнобыльскіх раёнах, бо там не ўдаецца вырошчваць чыстую прадукцыю. Ці магчыма гэта ўвогуле на забруджаных землях?**

**В.Л.:** Зьмена спэцыялізацыі — вынік таго, што няма грошай на калійныя ды фосфарныя ўгнаеньні. Калі няма калію ды фосфару, расьліны цягнуць з глебы стронцый з цэзіем. Зноў справа ў грашах.

**«НН»: Сёлета заплянавана сабраць 27—30 цэнтнэраў з гектару. Ці гэта рэальна?**

**В.Л.:** Летась па Менскай вобласьці пятая частка гаспадарак «атрымала» па 30 цэнтнэраў. Дзе гэтыя цэнтнэры? Які Лукашэнка аддасьць загад, столькі і напішуць. Я лічу, сёлета будзе 15—17 цэнтнэраў з гектару, ня больш. Я праехаў па рэспубліцы, бачыў, якой збажына выйшла з-пад зімы. А дзе яшчэ тры дні паляжыць сьнег, там усё задохне.

**Гутарыў АК**

# Як загінуў Кусэй і быў кантужаны Садам

## Два ахоўнікі Садама працавалі на спэцслужбы ЗША



Сыны Садама яшчэ разам: Кусэй і Ўдэй.

Кусэй, сын Садама Хусэйна, загінуў падчас амэрыканскага налёту ў першы ж дзень вайны — цьвердзяць добра паінфармаваныя крыніцы ў Вашынгтоне. Яны даюць 99,9% імавернасьці, што 38-гадовы Кусэй загінуў у бункеры пад прэзыдэнцкім палацам, які быў мэтаю ранішняга налёту 20 сакавіка, у дзень, калі пачалася вайна.

Экспэрты ў ЗША сьцьвярджалі, што ў часе бамбаваньня мог загінуць і сам кіраўнік Іраку. Але ў суботу іракцае тэлебачаньне паказала жывога Садама на багдадзкай вуліцы. І ўсё ж Пэнтагон не сумняецца, што і дыктатар паранены. Некалькі дзясяткаў крылатых ракетаў ды пара цяжкіх бомбаў, скінутых на палац, зьнішчылі надземныя і частку падземных паверхаў будынку. Садам атрымаў лёгкае страсеньне мазгоў і пашкоджаньне радужных абалонак вачэй.

Амэрыканцы дазналіся пра гэта дзякуючы інфарматарам — двум падкупленым яшчэ год таму афіцэрам злучэньня, што ахоўвае іракцага лідэра. Гэтыя людзі атрымалі ад амэрыканцаў спэцыяльныя радыёперадатчыкі, якія мусілі інфармаваць, дзе знаходзіцца дыктатар і яго найбліжэйшае атачэньне.

І 19 сакавіка абодва інфарматары паведамілі дакладныя каардынаты бункеру, у якім хаваўся Садам. Дырэктар ЦРУ давёў прэзыдэнту Бушу, што такая магчымасьць можа болей не паўтарыцца. Хоць пачатак нападу быў заплянаваны на пазьнейшы час, Буш загадаў атакаваць бункер. Разьлічваў, што сьмерць Хусэйна зробіць вайну карацейшай.

Абодва інфарматары пазьней паведамілі, што ў той дзень, апроч Кусэя, загінулі яшчэ некалькі асобаў, у тым ліку генэралы і ахоўнікі Садама. Самога яго вынесьлі з бункеру на насілках. Ён быў аглушаны, з вушэй цякла кроў. І, як сьцьвярджалі інфарматары, менавіта з прычыны пашкоджаньня вачэй ён мусіў начапіць цёмныя акуляры падчас телевыступу.

Вашынгтонскія крыніцы падкрэсьліваюць, што ЦРУ ўжо зь сярэдзіны 2000 г. плянавала замах на жыцьцё Садама. У Багдадзе з таго часу знаходзіліся афіцэры амэрыканскай выведкі, што трапілі туды з дапамогай курдзкіх і шыіцкіх апазыцыянэраў і агентаў іншых заходніх спэцслужбаў.

У студзені, калі стала зразумела, што вайна непазьбежная, у Багдад перакінулі мо нават пару сотняў супрацоўнікаў спэцпадразьдзяленьня ЦРУ. Гэта былыя марпехі і дэсантнікі, што па сканчэньні вайсковай службы перайшлі ў выведку. Менавіта яны скантакталіся з блізкімі да Хусэйна людзьмі, заахвоціўшы іх да здрады найстарэйшым зь вядомых чалавецтву аргумэнтам — грашыма.

Цяпер агенты ЦРУ ў Багдадзе займаюцца наводкаю самалётаў альянсу на цэлі, зборам інфармацыі пра вынікі бамбардаваньня, подкупам іракскіх чыноўнікаў і афіцэраў.

Тое, што ў найбліжэйшым атачэньні Хусэйна ёсьць інфарматары, і надалей было б адной з самых вялікіх таямніцаў Вашынгтону, калі б тыя ўжо не загінулі. Іракцая контравыведка на ўсякі выпадак расстраляла ўсіх людзей, што адказвалі ў той дзень за бясьпеку Садама, і ў тым ліку абодвух афіцэраў, якія працавалі на Амэрыку.

**МХ; «Washington Post», «Gazeta Wyborcza»**

# Зброя іракцай вайны



У Іраку выпрабаваная новая вэрсія бесьпілётніка «Predator» — «Hunter-Killer», прызначаная для зьнішчэньня стацыянарных цэляў.

Вайна — найлепшы спосаб, каб выпрабаваць новыя віды зброі. А таксама атрымаць новыя вайсковыя замовы. Якімі ж «навінкамі» карыстаюцца войскі альянсу ў вайне з Садамам?

Найперш гэта комплексы «Patriot—PAC-3», прызначаныя для зьнішчэньня балістычных ракетаў. Іх упершыню выпрабоўваюць у баявых умовах. Таксама ўзброеныя сілы ЗША выкарыстоўваюць дзесяць розных тыпаў бесьпілётных лятальных апаратаў. Пяхота выкарыстоўвае «Pointer» і «Shadow», марпехі — «Dragon Eye» і «Pioneer», ВПС — «Force Protection Surveillance System», «Global Hawk», «Predator». Апошні — заслужаны ўжо вэтэран, які паступова ўдасканальваўся ў часе вайсковых дзеяньняў. Так, у Косаве на яго ўсталявалі сыстэму лазэрнага навядзеньня ракетаў, у Аўганістане — супрацьтанкавыя ракеты «Hellfire». Дакладнасьць трапленьня была 100%! Але ў 2002 г., у Емэне, «Predator» даў маху: спудлаваў па машыне з шасьцю тэрарыстамі «Аль-Каіды». Але «бесьпілётны» — ня тое самае, што «няўлоўны»: пад Басрай іракцы зьбілі адзін такі самалёт — «Phoenix», што належаў да брытанскіх ВПС. «Нябачныя» ж для варожых радараў самалёты F-16 і F-117, больш вядомыя як «Стэлз», часам даюцца ў знакі ня толькі гвардыі Хусэйна, але й хаўрусьнікам. Так, нядаўна адзін з штурмавікоў памылкова зьнішчыў з супрацьтанкавай гарматы колькі брытанскіх браневі-коў. Экіпаж ратаваўся ўцёкамі.

Зважаючы на пагрозы Садама прымяніць сродкі масавага зьнішчэньня, войска ЗША выкарыстоўвае машыны радыялягічнай, хімічнай і біялягічнай выведкі з доўгай назвай «Fox Nuclear-Biological-Chemical Reconnaissance System», якая пераcоўваецца ў вайсковых калёнах і робіць усе неабходныя замеры.

Брытанская армія выпрабоўвае на іракцай вайне новы супрацьлодачны гелікоптэр EH-101 «Merlin», што паступіў на ўзбраеньне ў сярэдзіне 2002 г. Праўда, чараўніку Мэрліну ў іракцай пустэльні падводных чаўноў няма. Больш практычная ангельская навінка — сыстэма вызначэньня каардынатаў варожае артылерыі «HALO 2». Яны працуюць у каардынацыі са зьнішчальнікамі «Tornado GR4», нядаўна перааснашчанымі для пуску крылатых ракетаў.

Гэткіх бамбардаваньняў, як на гэтай вайне, сьвет раней ня бачыў. Вызначаюцца яны ня толькі маштабамі, але й працэнтам трапляньня. Больш як 80% бомбаў маюць сыстэмы дакладнага навядзеньня. Навіной гэтай вайны ёсьць і тое, што амаль усе бомбы забясьпечаныя JDAM (Joint Direct Attack Munition). Гэта прыстасаваньне, якое прыкручваецца да звычайнай бомбы і дае магчымасьць накіроўваць яе да цэлі пры дапамозе спадарожнікавай сыстэмы навігацыі GPS. Хібнасьць не перавышае 3 мэтраў. У адрозьненьне ад ранейшых сыстэмаў навядзеньня, JDAM працуе як днём, так і ноччу, незалежна ад надвор'я. Самалёту ня трэба «весьці» бомбу да самае цэлі, ён можа заставацца на вялікай вышыні. «Кінуў і забыўся», — як кажуць лётчыкі.

Адзін B-2 з 16 бомбамі, забясьпечанымі JDAM, паводле слоў генэралмаёра Фрэнкліна Блэсдэла, мае агнявую моц, раўназначную той, што мелі 1000 бамбавікоў з 9000 бомбаў падчас другой сусьветнай вайны. Эфэкт бамбаваньняў падмацаваны 1000 ракетаў тыпу «Тамагаўк», якія знаходзяцца на караблях у Арабскім моры і на самалётах B-52. Амаль усе гэтыя ракеты таксама забясьпечаныя спадарожнікавай сыстэмай навядзеньня. За два першыя тыдні вайны былі выкарыстаныя дзьве трэціны гэтых ракетаў. У першую вайну саюзнікі выпусьцілі толькі 284 такія ракеты.

**Сяргей Мікулевіч, Сяргей Радштэйн**



Ракетны комплекс «Patriot»

## Вэтэраны войнаў

У руках фэдаінаў Садама ўсё больш старыя савецкія «калашы». Але і ў англасаксаў старой зброі — пад завязку. Доўгажыхаром-рэкардсмэнам зьяўляецца брытанскі выведны самалёт «Canberra», што стаў на крыло аж у 1949-м. Не нашмат маладзейшая самаходная артылерыйская ўстаноўка «Paladin», распрацаваная ў 1950-я. Славутая вінтоўка М-16, вядомая нам па заходніх баевіках, узятая на ўзбраеньне амэрыканскім войскам у 1963 г. Саракагодзьдзе сёлета сьвяткуюць і бамбавальнікі B-52 — аснова стратэгічнае авіяцыі ЗША. Удвая маладзейшыя радыёстанцыі «Clansman», упершыню выкарыстаныя ў часе вайны за Фольклендзкія астравы, ствараюць гаспадарам-брытанцам купу праблемаў: іх паведамленьні праціўнік даўно навучыўся перахопліваць.



## Śviata ŭ Rosi

**25 sakavika moładź z parafijaŭ Śv.Jana Chryściciela (vioska Voŭpa) i Śv.Trojcy (miastečka Roś) naviedała kaplicu Śv.Stefana, jakaja znachodzicca na Roskich katalickich mohiłkach.** Tam pad kiraŭnictvam dyjakana maładyja ludzi malilisia za ŭsich pamierłych. Kaplica hetaja była zafundavana hrafam Stefanam Patockim. Paśla śmierci ŭ 1910 h. jon u joj i byŭ pachavany — u sarkafazie z čyrvonaha marmuru, jaki znachodziŭsia ŭ zachodnim ryzalicie. Tak adbyłosia tamu, što adnojčy Patocki ŭbačyŭ na dnie kapličnaha sklepu vadu i vykazaŭ pažadańnie: «Pachavajcie mianie vyšej, bo chvareju na radykulit». U 1959 h. niechta pa-barbarsku ŭzarvaŭ sarkafah. Vitražy ŭ 70-ja vybili kamianiami sałdaty miascovaj vajskovaj čašci. Ciapier kaplica zaniadbanaja i patrabuje restaŭracyi. Hetym pačaŭ zajmacca ksiondz-probašč parafii.

**Alaksiej Makaviecki, Roś**

## Крывіцкія крамы

**Прадпрымальнік Максім Станкевіч адчыніў у Крывічох гаспадарчую краму.** Людзі вельмі задаволеныя: ня трэба па кожны цьвік ляцець у Мядзела (так у нас называюць Мядзел). Асартымэнт багаты — каля 600 найменьняў. Месяцяцца «Гаспадарчыя тавары і будматэрыялы» на плошчы, ля мосту цераз Сэрвач, недалёка ад «Крынічкі» — прадуктовай крамы, якую Максімаў брат Руслан адчыніў з год таму. Маюць Станкевічы таксама краму ў Будславе. Зьбіраюцца адчыніць у Крывічох кавярню.

Іншы мясцовы прадпрымальнік, Леанід Дзевяітоўскі, рамантуе будынак колішняй дзяржаўнай цырульні — хоча перавезьці сваю краму ў прастарнейшае памяшканьне.

**Вацлаў Зьвяруга, Мядзел**

## Скавародка пераносіць кірмаш

**Мёрскі райвыканкам забараніў індывідуальным прадпрымальнікам гандляваць на плошчы па вул.Камуністычнай, што ў цэнтры гораду.** Ім прапанавалі перанесьці свае намёты на рынак райспажыўтаварыства. Апошні месяцціца на самым ускраіку Мёраў і працуе толькі ў нядзелі. 57 прадпрымальнікаў моцна наракаюць на выканкам: арэнда гандлёвага месца на цэнтральнай плошчы каштуе 3—4 тыс. руб., а за «бангалор» дзяруць пад 6 тыс. Апроч таго, РайСТ бярэ грошы за стаянку і за ўезд машыны на рынак. Мёрцы просяць старшыню райвыканкаму В.Скавародку пакінуць кірмаш у цэнтры гораду. Пад адпаведнай заявай стаіць ужо больш за 500 подпісаў.

**В.Ралейна, Мёры**

# Байк-шоў

**5 красавіка ў Менску адбылося сьвята байкераў, якія зьехаліся ў сталіцу з усёй Беларусі. Парад байкераў па менскіх вуліцах адбываўся пад пільным кантролем ДАІ, супрацоўнікі якой перапісалі ўсіх удзельнікаў (а было іх чалавек 40), правяралі дакумэнты і наяўнасьць шлемаў. Калёна байкераў прадэфілявала ад Акадэміі навук да праспэкту Машэрава. Там, недалёка ад футбольнага манежу, адбыўся канцэрт і конкурсы. Напрыклад, на самы моцны гук, самы прыгожы малюнак, выкананы колам матацыкла, ды інш. А закончылася сьвята вечарынай у клюбе «Рэактар», на якую «чужых» не запрашалі.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Biudžet pralacieŭ

**Nie prajšło i troch miesiacaŭ, jak daviałosia karektavać Baranavicki haradzki biudžet na 2003 hod.** Kali trymacca planaŭ, dyk da kanca hodu z 56 mlrd. rubloŭ biudžet nie atrymaje amal 3 mlrd. Sytuacyju vyrašyli vielmi prosta: na 15 haradzkich pradpryjemstvaŭ, što majuć prybytak, daviali dadatkovyja pakaźniki na padatki. Pradpryjemstvy, što ŭžo na miažy bankructva, ničoha dapłačvać nia buduć. Vidać, taki kryzys biudžetu praz toje, što ad horadu «zabrali» padatak na prodaž alkaholu.

## Pakarali za paklop

**Šmat hadoŭ vykryvaŭ apazycyjnyja «złačynstvy» ŭ Baranavičach žurnalist staroj zahartoŭki Ivan Bućko.** U studzieni hazeta «Zaria» nadrukavała jahony čarhovy artykul, u jakim žurnalist vinavaciŭ staršyniu Baranavickaha addzialeńnia «Fondu imia bratoŭ Łuckievičaŭ» Alesia Horbača. Zakidaŭ tamu machinacyji, kradziež hrošaj i abstalavańnia arhanizacyi. Bućko skarystaŭsia ŭ svajim «žurnaliscкim raśśledavańni» ananimkaj, jakaja niekalki miesiacaŭ raniej była razasłanaja praz elektronnuju poštu. Ź jaje cytavalisia celyja abzacy, z kamentarom — maŭlaŭ, hładzicie, jakija złydni.

Hazeta «Naš kraj» (niekali «Znamia kommunizma»), jak zaŭsiody, pieradrukavała artykuł Bućka.

Aleś Horbač źviarnuŭsia ŭ sud. Paličyŭšy źniavažanym svoj honar i hodnaść, jon zapatrabavaŭ kampensacyji: ad «Zari» — miljon, ad «Našaha kraju» — 20 młn. i ad samoha Bućka — 5 młn. rubloŭ. Na sudzie žurnalist nia zdoleŭ pradstavić nivodnaha dokazu da źviestak u svaim artykule. Sud, uličyŭšy ŭzrost dy invalidnaść adkazčyka, pastanaviŭ: Bućko spłačvaje Horbaču 200 tysiač rubloŭ, «Zaria» — 500 tysiač, a «Naš kraj» — 300 tysiač rubloŭ. Taksama aŭtar pavinien na staronkach hazetaŭ paprasić prabačeńnia.

Adnak pryhody sp.Bućko nia skončylisia. U sieradu pačynajecca razhlad jašče adnoj spravy. U tym samym artykule jon zdoleŭ abrazić jašče niekalkich hramadzkich i palityčnych dziejačoŭ horadu. Staršynia addzialeńnia BSDP (NH) Viktar Karlinski zanios tady zajavu ŭ sud. Kažuć, što Ivan Bućko dahetul nia vieryć u sudovaje rašeńnie: jak heta žurnalista ź dziaržaŭnaj hazety — i karajuć na karyść «vorahaŭ narodu»?

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**

## Застаўся бяз вудаў

**Нарачаншчына — край рыбацкі, і нават рабункі тут адметныя.** У Мядзеле проста на вуліцы 35-гадовы мужчына забраў у старэйшага калегі дзьве вуды і 160 мармышак. Пацярпелы некалькі тыдняў у міліцыю не зьвяртаўся, мо думаў сам вуды вярнуць. Але не ўдалося — мусіў пайсьці па дапамогу да міліцыянтаў.

**Алесь Высоцкі, Мядзел**

## Смургоням падорацъ гадзіньнік

**Смургоні рыхтуюцца да 500-годзьдзя.** Вядуцца будаўнічыя работы па вул.Савецкай, што ў цэнтры гораду. Яна, ад школы і да плошчы Леніна, будзе цалкам рэканструяваная згодна з праектам гарадзенскіх архітэктараў. Пакладуць новы асфальт, абновяць фасады дамоў, крамаў. Дахі пакрыюць мэталадахоўкай. На будынку гарадзкога быткамбінату зьявіцца гадзіньнік — але толькі ў тым выпадку, калі зьявяцца грошы. Уся цэнтральная частка гораду будзе адрамантаваная да восені.

**Андрэй Мялешка, Горадня**

# Далёка не сабачыя гісторыі

**Гады чатыры таму, адкрыўшы газэту «Из рук в руки», у рубрыцы аб продажы жывёл можна было ўбачыць дзясяткі тры-чатыры абвестак. Цяпер колькасьць такіх прапаноў наблізжаецца да дзьвюх соцень. Скажам "дзякуй" за гэта нашым кіналягічным клюбам, што распладзіліся, бы грыбы ў дажджлівае лета. Зь іх блаславеньня тысячы грамадзян адным разам сталі заводчыкамі-прафэсіяналамі і гаспадарамі гадавальнікаў, разьмешчаных у залях і кухнях тыповых хрушчобаў.**



IREX-PROMEDIA

Гэткая «заводчыца», нагледзеўшы на сабачай выставе няведнага наведвальніка, угаворвае яго набыць сабаку. Абяцае сусьветную вядомасьць, вяртаньне грошай, што пайшлі на пакупку, салідны прыбытак у «зялёных». Чалавек урэшце купляе чорнага лябрадора вельмі сьціплых паказьнікаў (яшчэ двух аддалі задарма клюбу службовай сабакагадоўлі, бо ніхто не купляў) за некалькі соцень «зялёных». Заводчыца адчувае магчымасьць далейшага пампаваньня грошай. Яна набіваецца да пакупніка ў хендлеры — так завецца той, хто рыхтуе сабаку да спаборніцтваў. Пасьля пераконвае гаспадара, што ў Беларусі для яго «прынцэсы» няма адпаведнага кабяля, і бедны сабакавод купляе цэлае купэ для паездкі ў Маскву, аплачвае ўсе выдаткі й шчодра спансуе хендлерку.

Праз паўтара месяца, калі «жывы куток» палез ва ўсе шчыліны, пакідаючы за сабой ручаі і купкі экскрэмэнтаў, ашалелы гаспадар тэлефануе падманшчыцы і нагадвае пра абяцаньне дапамагчы ўладкаваць шчанюкоў. «Вельмі шкада, — сумна кажа тая, — але рынак — гэта жывы арганізм і сёньня патрэбныя лябрадоры іншай масьці». Гаспадар зграі болей ня прагне міжнароднага прызнаньня і мэдалёў, не цікавяць яго і грошы. Ён стаміўся, спакутаваўся і невыносна хоча спаць, бо ўначы карміць шчанюкоў даводзіцца па чарзе. Нарэшце ён разумее, што яго «кінулі». І пачынае шрайбаць у газэты абвесткі, шукаючы «добрых рук». А праз тыдзень аддае сваіх лябрадораў задарма вядомай перакупніцы, якая пільна адсочвае такія абвесткі. Былы гаспадар стараецца ня думаць пра лёс сваёй чорнай дурасьлівай зграі. Шчанюкі прынесьлі яму шмат клопату, але сэрца пасьпела да іх прыкіпець.

Толькі цяпер ён прыгадвае, што неяк у тралейбусе, калі машына была ў рамонце, ён бачыў абвестку з заклікам не разводзіць бескантрольна жывёл, праводзіць біястэрылізацыю. Ну ды што цяпер зробіш…

Кіналягічныя клюбы ў іх цяперашнім выглядзе — чыста камэрцыйныя прадпрыемствы. Чым болей гаспадароў сабак уступае ў клюб, тым больш прадстаўнічымі будуць выставы, за кошт якіх клюб існуе. Некаторыя заводчыкі трымаюць дзьвюх сучак і, атрымліваючы ад клюбу «дабро» на вязку, пад адну радаслоўную афармляюць абодва вывадкі. Рынак перапоўнены сабакамі з падробнымі дакумэнтамі. Прапануючы шчанюкоў, бывае, кажуць: «Бярыце любога, але з дакумэнтамі 100 у.а., а бязь іх — 50!» З большай ахвотай бяруць за 50, а пад радаслоўную ідзе шчанюк зь іншага памёту, які ня мае адносінаў да дакумэнтаў. Ёсьць і такія «аматары», што змудраюцца трымаць і разводзіць па дзьве-тры пароды адначасова.

Час ужо клюбам перабудаваць сваю работу і адшукаць магчымасьці атрымліваць прыбыткі, не памнажаючы бедаў жывёл. Што важней для нашай краіны — мецэнат сабаку-чэмпіёна ці ня мець бадзяжных жывёл на вуліцах?

У красавіку адбудзецца разгляд у першым чытаньні Закону «Аб абыходжаньні з жывёламі». А пакуль штогод у Беларусі зьнішчаецца да 65 тыс. жывёл-кампаньёнаў.

**Маргарыта Пушкевіч**

## 18 красавіка пятніца

**● БТ**

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Лінія абароны». Сэрыял.
9.15, 17.05 «Тайны Ніра Вулфа». Сэрыял (ЗША).
10.00 Сад мары.
10.25 «На скрыжаваньнях Эўропы».
10.50 Кухня КВК.
11.05, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.30 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Маст. фільм «Алеся».
15.20 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Гэта клясна!». Сэрыял. Заключная сэрыя.
16.25 5х5.
19.10 Маст. фільм «Кветкі правінцыі».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Гісторыка-прыгодніцкі фільм «Атлянтыда».

**● СТВ**

5.00 Музычны канал.
5.30 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
5.55, 15.55 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.20, 15.25 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Новы экшэнмэн». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25, 13.30, 16.30, 19.30, 22.20 «24 гадзіны».
7.45, 19.50 «СТВ-спорт».
7.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.00, 18.15 «Менск і менчукі».
8.05, 22.40 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: камэдыя «Целаахоўнік і ўдава». ЗША, 1994.
9.45 «Каханьне». Дак. фільм.
10.25 «Гульнявы рэфлекс».
10.35 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
11.00, 20.35 «Аўтапанарама».
11.15 «Тэатральныя гісторыі».
11.30 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.25 «Народ супраць». Тэлегульня.
12.55 «Агенцтва». Сэрыял.
13.50, 18.40 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
14.35 «ЗБЖ, ці ...». Тэлесэрыял.
16.20 Мультфільм.
16.45 «Мэдыкі». Сэрыял.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.00 «Рэактыўны бокс».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: баявік «Забі ці памры». ЗША, 2001.
22.50 «Навіны СНД».
23.40 Кіно: трылер «Дзіцячая гульня». Францыя, 2001.

**● Першы музычны канал**

7.00 «Пад'ёмнік». Інфармацыйна-забаўляльная праграма ў жывым этэры.
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 22.10 УльтраМікс.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

**● АНТ**

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.25 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Шматсэрыйны фільм «Іншае жыцьцё».
10.45, 22.05 «Фабрыка зорак-2».
11.15 Сэрыял «Твінісы».
15.40 «Новы дзень». «Рэцэпты будыйскіх манахаў».
16.10 Дэтэктыў Агаты Крысьці «Забытае забойства». 2-я частка.
17.05 «Вялікае мыцьцё» з Андрэем Малахавым.
18.10 «Самі з вусамі».
18.40 Дак. дэтэктыў. «Хто забіў Ігара Талькова?»
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
23.40 Камэдыя «Паліцэйская акадэмія». ЗША, 1984 г.

**● РТР**

8.40 Сэрыял «Тайга».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 У пошуках прыгод.
17.50 Аншляг.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Расейскія амазонкі».
21.00 Ала Пугачова, Піліп Кіркораў, Клара Новікова, Іосіф Кабзон у сьвяточным канцэрце.
22.30 Прэм'ера. Крымінальная драма «Спакушальнік» (ЗША). 2001 г.

**● Культура**

15.10 Дзень Перамогі войска Аляксандра Неўскага на Чудзкім возеры. С.Пракоф'еў. Кантата «Аляксандар Неўскі».
15.50 «Гербы Расеі».
16.05 «Са столі».
16.30 «Скандал вакол віктарыны». Дак. фільм.
17.30 Весткі.
17.40, 23.00 Навіны культуры.
17.55 Паўдзённыя сны.
18.25 «Запіскі дыплямата. Анатоль Адамішын». Дак. сэрыял. Фільм 4-ы. «Ізноў у Італіі».
18.55 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.35 «Дапамажыце Тэлеку».
19.45 Рэтраспэктыва фільмаў да 85-годзьдзя кінастудыі «Ленфільм». «Кепскі добры чалавек». Маст. фільм.
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.25 «Хто там...».

**● НТВ**

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Нацыянальная бясьпека». Расьсьледаваньне НТВ.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.05 Сэрыял «Бандыцкі Пецярбург».
17.20 Каманда.ru.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Баявік «Дазвол на забойства».
22.30 «Усё адразу!».

**● Эўраспорт**

9.30 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
10.00 Вэляспорт. Трэк. Кубак сьвету. Паўтор.
11.00 Снукер. Кубак Эўропы. Мальта. Паўтор.
12.30, 17.30, 20.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя. Паўтор.
14.30 Футбол. Кубок Лібэртадорэс. 11-ы дзень. Паўтор.
16.30 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Пантыяк. Паўтор.
19.00 Сумо. Басё. Японія.
22.00 Формула.
22.15 Ралі. Новая Зэляндыя. Агляд.
23.15 Ралі Рэйд. Туніс.
23.45 Тэніс. WTA. Амэлія Айлэнд. Чвэрцьфінал.
1.00 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

## 19 красавіка субота

**● БТ**

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Экран індыйскага кіно. «Падрыхтоўка да вясельля». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе.
11.30 «Сьпявай, душа!». Фальклёрныя калектывы Слуцкага раёну.
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Дуброва. Родавы маёнтак Ваньковічаў».
12.55 Сола для дэбютанта. Ганна Хітрык (актрыса).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 «Ёсьць толькі міг...».
14.00 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства» (Англія). Фільм «Да самай сьмерці». 1-я сэрыя.
15.15 «Дабранач, мама!». Відэафільм АТН.
15.45 «Маршрут №...».
15.50 Кухня КВК.
16.00 «Містар Бін». Сэрыял.
16.30 КВК. 1/8 фіналу Эўралігі.
18.10 «На скрыжаваньнях Эўропы».
18.40 Мэлядрама «Знахар» (Польшча). 1-я і 2-я сэрыі.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.25 Галоўнае пытаньне.
22.05 Маст. фільм «Дотык рукі».
23.45 Сьвяточнае богаслужэньне на Вялікдзень у касьцёле сьв.Барбары. Перадача зь Віцебску.

**● СТВ**

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Вайна і канфлікты» з цыклу «Вынаходкі старажытных». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50, 19.50 «СТВ-спорт».
9.00 «Рэактыўны бокс».
9.15 «Адпачывай».
9.25 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.50 Кіно: прыгодніцкі фільм «Джуманджы». ЗША, 1997.
10.45, 20.05 Кіно: шматсэрыйны фільм «Ад'ютант яго эксцэленцыі». СССР, 1969.
12.05 «Разам».
12.45 «Філярманічны тыдзень».
12.50 «Рамонт».
13.05 Кіно: дэтэктыў «Расьсьледаваньне». СССР, 1980.
14.50 «Відавочца».
15.25 «Усё для цябе».
16.00 «Капітан Праўда». Сэрыял.
16.35 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
17.00 «Запрашаем паскардзіцца».
17.10 «Аўтапанарама».
17.30 Кіно: камэдыя «Налева ад ліфта». Францыя, 1987.
19.30 «24 гадзіны».
21.30 Кіно: трылер «Уцёкі». ЗША, 1994.
23.25 «Навіны СНД».
23.05 Кіно: трылер «Бязь імені».

**● Першы музычны канал**

8.00 Рухач.
17.00 Музыка.RU.
18.00 УльтраМікс.
23.00 МэгаМікс.

**● АНТ**

8.00, 12.00 Навіны.
8.20 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.15 «Смак».
10.35 Сьмехапанарама.
11.15 «Сярэбраны шар».
12.10 «Падарожжы натураліста».
12.40 «Новы дзень». «Крылы».
13.10 Разумніцы й разумнікі.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.15 «Новы дзень». «Геніі і ліхадзеі».
14.45 Жывая прырода. «Браты па крыві».
15.40 Камэдыя «Кот у мяшку».
17.15 «Песьня году. Вясна».
19.00 «Хто хоча стаць мільянэрам?» .
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Апошні герой-3».
21.55 Прэм'ера. Баявік «Выбітны». Ганконг—Кітай.
23.45 Трылер «Пагоня за сьмерцю». ЗША.

**● РТР**

8.45 Ранішняя пошта.
9.20 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
10.15 Сам сабе рэжысэр.
11.15 У пошуках прыгод.
12.10 Клюб сэнатараў.
13.00 Весткі.
13.20 Дэтэктыў «Сьледзтва паказала». 1980 г.
15.00 Чэмпіянат Расеі па футболе. «Спартак—Аланія» (Уладзікаўказ) — «Лякаматыў» (Масква). Жывая трансьляцыя з Уладзікаўказу.
17.00 Мая сям'я.
18.00 Аншляг.
19.00 Весткі.
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.15 Сусьветнае кіно. Авантурная камэдыя «Сэрцаедкі» (ЗША). 2001 г.
22.40 Трылер «Шэсьць» (Францыя). 2000 г.

**● Культура**

11.15 «Пецярбург-300». «Сумеснае пражываньне». Дак. фільм.
11.30 ГЭГ.
11.45 «Графаман».
12.10 Дзіцячы сэанс. «Кентэрвільскі прывід», «Хітрая варона». Мультфільмы.
13.20 «Дагістарычны сьвет». «Малюткі-монстры».
13.50 «Борхес і я». Дак. фільм.
15.05 «Срэбранае стагодзьдзе пецярбурскай рэжысуры». М.Булгакаў. «Дні Турбіных». Спэктакль Маладзёвага тэатру (Санкт-Пецярбург).
17.45 Магія кіно.
18.15 У вашым доме.
18.55 «Сфэры».
19.35 «Поўны нягоднік». Тэлесэрыял. 13-я сэрыя, заключная.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Легенда Багера Ванса». Маст. фільм.
23.20 «Пад гітару». Аляксандар Мірзаян.

**● НТВ**

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00 Сёньня.
9.05 «Кулінарны паядынак».
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
11.05 «Прафэсія — рэпарцёр».
11.25 Служба выратаваньня.
12.05 Камэдыя «Мы з вамі дзесьці сустракаліся...»
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.05 Камэдыя «Грошы вырашаюць усё» (ЗША).
18.00 «Сёньня» з Кірылам Пазьняковым.
18.35 Прэм'ера 2003 г. Дэтэктыў «Сышчыкі-2». 1-я сэрыя.
19.45 XVI Урачыстая цырымонія ўручэньня Нацыянальнай кінэматаграфічнай прэміі «Ніка».

**● Эўраспорт**

9.30 Рэйд прыгод. Паўтор.
10.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. 11-ы дзень. Паўтор.
12.00 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Жывая трансьляцыя.
15.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя. Паўтор.
17.00, 20.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя. Жывая трансьляцыя.
19.00 Сумо. Басё. Японія.
22.00 Тэніс. WTA. Амэлія. Другі паўфінал. Жывая трансьляцыя.
0.00, 0.30 Экстрэмальныя віды спорту.
1.45 Формула-3000. Імола.

## 20 красавіка нядзеля

**● БТ**

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.00 Віншавальнае слова арцыбіскупа, Апостальскага нунцыя ў Беларусі Івана Юрковіча на Вялікдзень.
9.10 Алхімія слова.
9.15 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.40 Экран індыйскага кіно. «Падрыхтоўка да вясельля». 2-я сэрыя.
11.15 Сад мары.
11.45 Музэюм. «Велікодныя пісанкі».
12.15 «Усё нармальна, мама!»
13.00 «Ваша лята».
13.40 Існасьць. Духоўная праграма.
14.05 «Маршрут №...».
14.10 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства» (Англія). Фільм «Да самай сьмерці». 2-я сэрыя.
15.15 «Касыяпэя». Сэрыял.
15.40 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.30 Кліп-абойма.
17.10 Драма каханьня «Франка» («Беларусьфільм»).
18.50 Іў Мантан у фільме-прытчы «IP-5» (Францыя).
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.10 Камэдыя «Вясельны пярэпалах» (ЗША).

**● СТВ**

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Выратавальнікі». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «СТВ-спорт».
9.05 «Менск і менчукі».
9.15 «Партрэт у інтэр'еры».
9.30 «Аўтапанарама».
9.50 Кіно: прыгодніцкі фільм «Джуманджы». ЗША, 1997.
10.40, 20.10 Кіно: шматсэрыйны фільм «Ад'ютант яго эксцэленцыі». СССР, 1969.
12.05 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
12.30 «Добры дзень, доктар!».
12.45 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
13.05 Кіно: музычная камэдыя «Чарнаморачка». СССР, 1959.
14.55 «Відавочца».
15.25 «Сусьветныя розыгрышы».
16.00 «Другое дыханьне». Сэрыял.
16.35 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
17.00 «Залатая дзясятка Беларускай опэры».
17.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
18.20 «168 гадзін».
19.05 «Усё для цябе».
19.35 «Пакуль гарыць сьвечка».
21.30 «Гульнявы рэфлекс».
21.45 Кіно: трылер «Акно ў спальні». ЗША, 1987.
22.40 «Навіны СНД».
22.55 Музычная праграма «Песьні каханьня».

**● Першы музычны канал**

8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў». Культуралягічнае шоў.
13.00 «Пра Fashion». Модная праграма.
17.00 Музыка.RU.
18.00 УльтраМікс.
23.00 МэгаМікс.

**● АНТ**

8.00, 12.00 Навіны.
8.20 Армейскі магазын.
8.50 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.15 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 Дог-шоў.
12.10 «Новы дзень». «Каралі сьмеху». «Прытворнікі».
12.40 «Клюб падарожнікаў».
13.20 «Ералаш».
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.15 «Валадар смаку».
15.15 Ток-шоў «Выбар».
15.55 «Куміры».
16.25 «Рэкорды «Вялікага мыцьця». Спэцыяльны выпуск.
18.15 КВК-2003. Вышэйшая ліга.
20.30 Контуры.
21.10 Вялікая прэм'ера. Баявік «Улада агню».
23.05 Часы.
0.05 «Дзіброў-party».

**● РТР**

9.15 Ранішняя размова зь Дзьмітрыем Кісялёвым.
9.50 «Гарадок».
10.20 Парад камэдый. Маст. фільм «Тры ніндзя» (ЗША). 1998 г.
12.10 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Вакол сьвету.
14.15 Дыялёгі пра жывёл.
15.20 Сьвет на мяжы.
15.50 Пакой сьмеху.
16.50 Прэм'ера. Прыгодніцкі фільм «Конга» (ЗША). 1995 г.
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Псыхалягічная драма «Інстынкт» (ЗША). 1999 г.
22.50 Чэмпіянат сьвету па аўтогонках у клясе «Формула-1». Гран-пры Сан-Марына. Трансьляцыя з Імолы.

**● Культура**

11.10 «Пецярбург-300». «Завулак і яго насельнікі». Дак. фільм.
11.25 «Рыцары сьмеху». «Шчасьлівае сямейства».
11.50 Нядоўгія гісторыі.
12.05 Дзіцячы сэанс. «Салавей». Маст. фільм.
13.25 Ізноў пласьцінка пяе.
13.50 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.45 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
15.10 Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру. Дж.Вэрдзі. «Аіда». Фільм-опэра.
18.00 Да 85-годзьдзя з народзінаў Георгія Віцына. «Апэрацыя «Юбілей».
18.40 «Па запалкі». Маст. фільм.
20.15 Вечары ў тэатры «Школа сучаснай п'есы».
20.55 «Болей чым каханьне».
21.35 «Культ кіно» з Кірылам Разлогавым. «Трус». Маст. фільм.
23.25 «Джазафрэнія».

**● НТВ**

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
9.05 Сэрыял па нядзелях. «Каханьне ўдаўца». 4-я сэрыя (ЗША).
10.05 «Расьліннае жыцьцё».
10.40 Вы будзеце сьмяяцца!
11.05 «Уплыў».
12.05 Дэтэктыў «Разьвітальная гастроль «Артыста».
13.45 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 Экстрэмальны кантакт: рыфавыя акулы.
15.45, 16.06 Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.05 «Найноўшая гісторыя». «Пакаленьне next».
18.00 «Сёньня» з Кірылам Пазьняковым.
18.35 Дэтэктыў «Сышчыкі-2». 2-я сэрыя.
19.45 Фільм тыдня. Прэм'ера. Крымінальная камэдыя «Васабі».
21.35 Дэтэктыў «Паляваньне на сутэнёра».
23.30 Сэрыял «Клан Сапрана». 25-я сэрыя (ЗША).

**● Эўраспорт**

9.30 Тэніс. WTA. Амэлія. 1-ы паўфінал.
10.30 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя. Паўтор.
12.00, 21.30 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Жывая трансьляцыя.
14.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя. Жывая трансьляцыя.
16.00 Вэляспорт. Кубак сьвету. Жывая трансьляцыя.
18.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя.
20.00 Тэніс. WTA. Амэлія. Фінал. Жывая трансьляцыя.
0.15 Аўтагонкі сэрыі наскар. Мартынсьвіл.
1.15 Аўтагонкі сэрыі індыкар. Матэгі.

## ПРЭЗЭНТАЦЫІ

### «Лісты да хома саветыкуса»

**11 красавіка а 19-й гадзіне ў Беларускім ПЭН-цэнтры ў Менску** (вул.Казлова 7-101) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі «Лісты да хома саветыкуса» гарадзенца Сяргея Астраўцова, сталага аўтара «НН» ад часу яе аднаўленьня.

Кнігу складаюць тэксты, напісаныя ў 1991—2002. Яны друкаваліся ў «Нашай Ніве», «Пагоні», «Свабодзе» ды іншых выданьнях. Некаторыя зь іх напісаныя былі для радыё «Свабода». У тэкстах адлюстраваныя беларускія падзеі праз «гарадзенскія акуляры».

### Швэды ў гісторыі Беларусі

**15 красавіка а 19-й гадзіне** Беларускі ПЭН-Цэнтар, часопіс «ARCHE» і Цэнтар скандынаўскіх дасьледаваньняў Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту прэзэнтуюць бэстсэлер Андрэя Катлярчука «Швэды ў гісторыі і культуры беларусаў». На сустрэчу прыляціць з Стакгольму аўтар. Пра месца сустрэчы можна даведацца праз тэл. 288-14-61. Яно яшчэ ўзгадняецца.




### Ілюстраваная гісторыя Беларусі

**Новая кніга Ўладзімера Арлова, ілюстраваная Зьмітром Герасімовічам**, будзе прэзэнтаваная ў Нацыянальнай бібліятэцы 17 красавіка а 18-й. Гэтае ўнікальнае выданьне, аддрукаванае ў Славаччыне, зьмяшчае 1800 каляровых ілюстрацый. Чытачам яго прадставяць аўтары.

ВОДГУКІ

# Шкада мужыкоў

**Невялічкая інфармацыя «Івацэвічына ў агні» ў «НН» №9 прымусіла яшчэ раз падумаць пра тое, што адбылося і аб чым даведаўся трохі раней.** Сам я родам з тых краёў. Жытлін — вёска, суседняя з маёй, а хлопца, які згарэў, ведаў са школы — ён мой пагодак. Менавіта хлопца — той нежанаты быў. Рахманы, сьціплы, прыветны, бяскрыўдны, хоць і «ланцужок» здарэньня той самы: выпіў—закурыў—заснуў. Пакуль пажарныя з Івацэвічаў даехалі (18 км гравійкі), амаль усё згарэла.

Пажарныя сваю справу зрабілі і зьехалі, а людзі пахадзілі, паглядзелі ды так і кінулі абгарэлага на папялішчы, бо з сваякоў — толькі дзед нямоглы (праз тыдзень памёр). А за ноч небараку сабакі на часткі парвалі, пагрызьлі і па сьнезе расьцягалі.

Сабралі потым людзі тое, што знайсьці ўдалося, укінулі ў труну — ды ў зямельку-матухну, няхай яна яму пухам будзе.

Шкада людзей, асабліва мужыкоў, — ня за што гінуць, ламае іх час.

**Юрась Нераток, Менск**

# Чужая вайна

**Дзіўна было чытаць ліст спадара Аўгена з Прагі, які жадае, калі расставіць усе кропкі над «і», паваяваць на тэрыторыі далёкай суверэннай дзяржавы.**

Ёсьць шмат іншых спосабаў умацаваць беларускую дзяржаўнасьць, спадару Аўген. І галоўная задача — гэта яднаньне беларускага народу вакол адзінай нацыянальнай ідэі-інтэрасу — ідэі дабрабыту Беларусі, які грунтуецца на дабрабыце кожнага грамадзяніна краіны. А калі мы зноў пачнём падзяляць сябе — хто за Садама, а хто за Буша, — то гэтым мы толькі зробім Беларусь слабейшай.

**Андрэй Ананьеў, Гомель**

УДАКЛАДНЕНЬНЕ

# Пурым — гэта ня «пост»

**Дзякуй «Нашай Ніве» за тое, што почасту згадвае на сваіх старонках пра юдэйскія сьвяты, а калі-нікалі й віншуе.** Заўжды прыемна пабачыць новыя здымкі Анатоля Клешчука. Аднак у тэксьце пра вясёлае сьвята Пурым («НН» ад 21 сакавіка 2003 г.) ёсьць пара памылак. Пурым — гэта ў перакладзе з іўрыту ня «пост», а «жэрабя». Жэрабя — бо жыцьцё габрэяў калісьці залежала ад выпадку. Дзеці шумяць трашчоткамі ў сынагозе не для таго, каб адгнаць злых духаў, як напісана ў газэце, а для таго, каб падчас чытаньня біблійнай кнігі Эсьфір заглушыць імя зладзюгі Гамана, які намагаўся ўчыніць генацыд габрэяў у Пэрсыдзкай імпэрыі ў старадаўнія часы, а замест гэтага сам быў пакараны. Хоць у пераносным сэнсе яго можна, канечне, лічыць «злым духам»...

Вашыя памылачкі — дробязь у параўнаньні з тым, што часам даводзіцца чытаць «на габрэйскую тэму». У даведніку «Народная культура Беларусі» шаноўны доктар навук Цітоў зьблытаў сьвяты Песах і Сукот (кучкі). На кнізе Гірша Смоляра «Менскае гета» чамусьці пазначана, што Менск быў адзіным горадам у Савецкім Саюзе, дзе нацысты стварылі габрэйскае гета. Вось жа, толькі ў Беларусі было больш як 150 гета — месцаў канцэнтрацыі і зьнішчэньня габрэяў, цыганоў, ваеннапалонных.

**Вольф Рубінчык, Менск**

# Вераб'і, Сталін і Мао

**Пачатак 1953 году, я ў шостай клясе расейскамоўнай школы аднаго з раённых цэнтраў Гарадзеншчыны.** На ўроку заалёгіі настаўніца расказвае нам, што ў Кітаі вырашылі зьнішчыць усіх вераб'ёў, бо яны зьядаюць значную частку ўраджаю збожжа. Настаўніца кажа, што пэўная ў посьпеху гэтай справы, бо кітайцы вельмі дружны і працаздольны народ. А мы ж, вучні, добра ведаем і часта сьпяваем песьню: «Русский с китайцем — братья навек... Сталин и Мао слушают нас».

Таму мы верым, што кітайцы зьнішчаць усіх вераб'ёў, што гэта вельмі важная справа, і чамусьці ніхто з нас не пашкадаваў няшчасных птушак.

У пачатку сакавіка памірае Сталін. Настаўнікі плачуць. Мы таксама ўсьлед за імі.

Маці кажа мне: «Чаго ты плачаш па гэтымірадзе?» Пытаюся: «Чаму наш любімы Сталін — ірад?» І тут бацька расказвае мне тое, аб чым дагэтуль маўчалі ў нашай сям'і: у 1937 г. як ворагаў народу расстралялі яго дзядзьку з жонкай, а малыя іх дзеці недзе згубіліся. Потым бацька расказвае аб раскулачваньні, аб высяканьні садоў, каб не плаціць вялікага падатку за кожнае дрэва, нагадвае мне, як плакала я, калі ў калгас забралі нашу кабылку і жарабя. І я ўжо ня плачу аб Сталіну.

Жыцьцё ідзе наперад. XX зьезд КПСС. Культ асобы Сталіна разьвянчаны.

Я вучуся ў Слонімскай мэдвучэльні, затым у Менскім мэдінстытуце. Прыходзіць да нас інфармацыя з Кітаю, што ім давялося купіць у Эўропе і зноў разьвесьці вераб'ёў, бо пасьля зьнішчэньня гэтых птушак рэзка зьнізілася ўраджайнасьць збожжа. Распладзіліся шкодныя насякомыя, якіх зьнішчалі вераб'і. А ў Беларусі тады яшчэ вельмі многа жыло-было верабейчыкаў. Працуючы дзіцячым доктарам, я часта супакойвала хворых дзяцей вершамі пра вераб'я.

А тут аб'яўлена, што верабей — «Птушка 2003 году». А Кітай цяпер — адна з самых эканамічна разьвітых краін сьвету. У мяне таксама шмат кітайскіх рэчаў.

Выходзіць, што 50 гадоў назад наша настаўніца мела рацыю, калі казала, што кітайцы дружныя і працаздольныя, што яны даб'юцца ўсяго, чаго хочуць. А мы, беларусы, таксама працаздольныя і даволі дружныя, але дажыліся за гэтыя 50 гадоў да таго, што нават вераб'і пачалі выміраць у нашай краіне.

Хочацца хоць што-небудзь зрабіць для Беларусі, таму кармлю ўсю зіму нашых вераб'ёў, стараюся як мага часьцей размаўляць па-беларуску, вывучаю гісторыю Вялікага Княства Літоўскага і чытаю «Нашу Ніву». Жыві, Беларусь!

**Антаніна Казырыцкая, Крупкі**

КРАЯВІДЫ

# Руіны пры новабудоўлях

**Цяпер, у час росквіту культавага дойлідзтва, на ўскрайку Гомелю разбураецца занядбаная Мікалаеўская царква.** Мураванае стварэньне ангельскага архітэктара Кларка сустракае сваё двухсотгодзьдзе ў напаўразваленым стане. Старажылы прыгадваюць, што за камуністамі ў царкве паказвалі кіно, пасьля зрабілі краму. Калі будынак зусім заняпаў, трох'ярусную званіцу аблюбавалі альпіністы. Цяпер, кажуць, начамі там зьбіраюцца сатаністы.

Стан Мікалаеўскай царквы афіцыйна называецца часовай кансэрвацыяй. Насамрэч прыкметаў таго, што будынкам апякуецца дзяржава, няма. Зеўраюць дзьверных праёмы, усярэдзіне — лужыны й сьмецьце. Увесну, калі адлікаць, з вышыні валяцца абломкі цэглы. Царкоўнікам і пагатоў не патрэбны бяздоглядны храм: куды прасьцей прыладзіць цыбуліну на будыніну, падобную да ангару, што засталася ад кінатэатру «Спадарожнік», ці на дах былых ясьляў №2.

Тым часам вільгаць і маразы разьядаюць Мікалаеўскую царкву, а яна ж — першая ў Гомелі царква-камяніца. Праўда, вёска Валатава стала часткай гораду параўнальна нядаўна, але ўсе мураваныя цэрквы старога Гомелю пабудаваныя пазьней за Мікалаеўскую. Цікава, чаму тагачасны ўладальнік гораду Мікалай Румянцаў распачаў будаўніцтва храмаў зь вясковай царквы? Лічыцца, што графа прывабіў тамашні краявід, але мясцовы стары расказваў мне легенду, як Румянцаў ледзь не патануў ля іхняй вёскі ў час рачной прагулкі, а вяскоўцы выратавалі яго. Пабудаваўшы царкву, гаспадар аддзячыў ім за выратаваньне. Магчыма, крыху праўды ў гэтым апавяданьні ёсьць, бо шлях па Сажы ад парку да Валатавы быў першым прагулачным маршрутам Гомелю.

Праваслаўны граф пабудаваў на ўласныя сродкі касьцёл і даў фундуш на будаўніцтва сынагогі. Дык ці не была царква ў Валатаве кампэнсацыяй уніятам за разбураны ў час рэканструкцыі палацу кляштар з драўлянай Мікалаеўскай царквой?

Яшчэ нядаўна пра закінутую царкву мала хто ведаў. Цяпер да яе падступаюць новабудоўлі. Людзі прыходзяць падзівіцца на стадаўнія муры, бо руіны ў спрадвеку драўляным горадзе — экзотыка.

**Сяргей Баранаў, Гомель**

**Ад Рэдакцыі.** Тагачасны ўладальнік гораду Мікалай Румянцаў пабудаваў царкву ў Валатаве, пра якую піша сп.Баранаў, як дэталь краявіду, што адкрываўся з палацу. Бялюткая царква сярод лясістых узгоркаў, містыка і прыгажосьць… На жаль, мастацтва краявіду ў Беларусі забытае. Як відаць зь ліста, помнікаахоўным арганізацыям не ўдаецца ратаваць ня тое што краявіды, а і асобныя памяткі гісторыі і культуры.

Людка Сільнова

# Чалавек, які маляваў знакі


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Сьвет перакуліўся, як стары гадзіньнік, — і пясок часу пасыпаўся ў адваротны бок...

Калі я была студэнткаю філфаку БДУ, сустракалася з хлопцам з Іраку. Ён быў на многа гадоў старэйшы за мяне, хоць вучыўся на падрыхтоўчым факультэце.

Імя яггонае было Рахман, якое не падавалася мне чужаземным. Бо гучала неяк па-свойму, як імя майго стрыечнага брата — Раман. І нешта рахманае, добрае, мудрае чулася мне ў ім.

Мы пазнаёміліся з Рахманам у час падрыхтоўкі да Новага году на факультэце. Я размалёўвала зыркімі фарбамі сьвяточны нумар насьценнай газэты, а ён зазірнуў да нас на катэдру (былі расчыненыя дзьверы). Пасьля пары фразаў размовы ён узяў з маіх рук пэндзлік і намаляваў ля зялёнае ігліцы некалькі арабскіх узорыстых словаў тонкімі чырвонымі лініямі. І побач некалькі рэчаў-сымбаляў: марскія зоркі, паўмесяцы, смажовыя дамкі… Так ля маёй убранай у цацкі сьвяточнай ялінкі зьявіўся «арабскі куток».

У яго была цяга да маляваньня знакаў. Калі пасьля заняткаў мы заставаліся ў аўдыторыі адны, ён браў крэйду і пісаў на дошцы знакі ў выглядзе сьпіралі, якая раскручвацца. Сьпіраль сканчалася рыскай уніз і зьлёгку нагадвала пытальнік. Я неяк пацікавілася, што гэта значыць. А Рахман сказаў, што гэты знак вельмі старажытны і мае значэньне «любоў». І ўдакладніў, што сьпіраль, якая малюецца наадварот — скручваецца і зьнікае, — азначае адваротнае.

Гэтыя знакі я бачыла і на яггоных сшытках.

Ён любіў лашчыць вачыма мае чорныя валасы, разабраныя на просты прабор і завітыя паводле тагачаснай моды. Гаварыў, што я падобная да іракцкай дзяўчыны. Магчыма, у тыя хвіліны ён успамінаў сваю сястру ці нявесту, якую пакінуў у далёкай зямлі.

Як Рахман радаваўся нашай зіме, сьнегу! Узгадваю буйныя белыя сьняжынкі, гэтаксама падобныя да знакаў ці зорак, якія доўга не раставалі на яггоным чорным, простым, як бы ніякім паліто…

Аднойчы мы пайшлі зь ім у Музэй вялікай айчыннай вайны. Першы і адзіны раз выбраліся разам у горад! (Мы хацелі наведаць Мастацкі, але там быў выходны.)

Рахман няўважліва аглядаў напаўцёмныя залі. Зброя яго мала цікавіла. А вось павялічаныя фатаздымкі мірных ахвяраў, я заўважыла, моцна хвалявалі. Асабліва доўга затрымаўся ён каля выяваў павешаных гітлераўцамі менскіх падпольшчыкаў. Па вялікіх залях таго музэю мы блукалі чамусьці зусім адны. Больш наведнікаў не было.

Мне на ўсё жыцьцё запомнілася, як — ад страху? — узяўшыся за рукі, мы ўвайшлі ў апошнюю залю, нібы залітую сьвятлом, зь яркай каляровай мазаікай насупраць уваходу. І так пайшлі да вялікага белага бюсту Леніна, асьляпляльнага, як сонца, — пасьля змрочных заляў з выявамі чалавечых пакутаў. Гэта было як абяцанае патрапленьне ў Эдэм! Або — у Храм, толькі адпаведны часу — савецкі…

Праз некалькі месяцаў жыцьцё разьвяло нас у розныя бакі. Я згубіла яггоны сьлед. Магчыма, Рахман працягваў вучобу ўжо ня ў Менску, як і некаторыя студэнты зь яггонага факультэту.

Адна сяброўка гаварыла мне тады: «Людка, не губляйся!» І паказвала дасланыя прыгожыя фатаздымкі сваёй сястры, якая выйшла замуж за ліванца. Але я пра замужжа тады ня думала: вучоба толькі пачыналася… Тое, што было паміж мной і Рахманам, вызначалася найлепш словамі «рамантычнае пачуцьцё». Нават хутчэй гэта было студэнцкае сяброўства.

Дарэчы, мы, студэнты і супрацоўнікі падрыхтоўчага факультэту, дзе я нядоўгі час працавала лябарантай, называлі тады іракцаў «іракійцамі». Як фракійцы ці арыйцы… Хаця слоўнік Крапівы падае як сучасную літаратурную норму «іракцы», «іракец». Але хіба тое, пра што я тут пісала і чым жыла, — літаратура?..

Поўнае імя свайго студэнцкага каханьня я знайшла, пераглядаючы тэчкі хатняга архіву на пачатку цяперашняй вайны ў Іраку: Абдулрахман Кадзім. Гэтак была названая нізка вершаў, прысьвечаная майму герою. Частка іх была надрукаваная на тонкай, зьлёгку зеленаватай, хрумсткай паперы. Гэта была як сустрэча з самой сабой!

Усе вершы з тае папкі былі запісаныя на расейскай мове, якой крыху валодаў і Рахман. І толькі адзін — на беларускай. Вось яггоныя першыя радкі:

Каханьне маё —
Нібы белы ручнік.
На ім я крыжом
Кожны дзень вышываю,
Узор беларускі
З арабскім узорам
Няўмелымі пальцамі
Я кампаную...

Магчыма, гэта Рахман навучыў мяне чытаць, любіць і шукаць знакі. І верыць, што як была ад часоў Бабілёну, гэтак і засталася ў чалавецтва, дзесьці ў тайніках сьвету, Супольная Мова…

Сёньня я ўглядаюся трохі ня так, як мае суайчыньнікі, у трывожныя тэлевізійныя кадры — быццам стараюся адшукаць знаёмыя рысы твару ці выпадкова пачуць яггонае імя. Дзе ён? Ці жывы? Ці дажыў ён наагул да гэтага «Шоку і жаху»?.. «А можа, ён цяпер і не ў Іраку зусім...» — думаю я.

І ўсё мне здаецца, што я яшчэ сустрэну гэтага Альхіміка.

# Міндоўга ставяць доўга



Праект Чарнякевіча больш сымбалічны: стылізаваная вежа-данжон будзе зарыентаваная па сонцы, каб у тую гадзіну, калі адбывалася каранацыя, скрозь прарэзаныя насупраць крыж і карону праходзіў сонечны прамень.

**Скульптураў беларускіх гістарычных дзеячоў у краіне вобмаль. Сярод іншых «манумэнтаў, якіх няма», можна назваць і помнік Міндоўгу, адзінаму ўласна беларускаму каралю. Адкрыцьцё або закладка такой скульптуры прадугледжваецца праграмай сьвяткаваньня 750-годзьдзя каранацыі князя. На паседжаньнях аргкамітэту сьвята згадвалася імя Валяр’яна Янушкевіча, які некалі распрацоўваў помнік Міндоўгу. Амаль гатовы праект стаіць у майстэрні скульптара. Гэта можа быць першая конная скульптура беларускаму гістарычнаму дзеячу.**



Праект В.Гіголы алегарычна адлюстроўвае закладаньне падвалінаў беларускай дзяржаўнасьці.

Манумэнты манархаў-вершнікаў — ці не найлепшае ўвасабленьне велічы дзяржаўнай ідэі. Згадаць хоць бы статую Карла Вялікага альбо расейскага Меднага Вершніка.

Яшчэ ў сярэдзіне 90-х В.Янушкевіч езьдзіў у Наваградак выбіраць месца для помніка і дамаўляцца з уладамі. Тагачасны міністар культуры Анатоль Бутэвіч і наваградзкія чыноўнікі гэтаму спрыялі, але забракавала грошай. У другой палове 90-х ідэя была пахаваная з палітычных прычынаў.

Старшыня аргкамітэту Анатоль Грыцкевіч зазначыў, што на паседжаньнях пакуль не абмяркоўвалася канкрэтная працэдура выбару і ўсталяваньня помніка. Тым часам, свае варыянты манумэнту на разгляд у аргкамітэт даслалі санкт-пецярбурскія беларусы Ігар Жураўскі, Іван Чарнякевіч і Вячаслаў Гігола.

Праект І.Жураўскага — узброены рыцар зь лятэранскім крыжам на грудзях. Выява мусіць стаяць на невысокім пастамэнце зь неапрацаванага каменю, аздобленым шыльдай з бронзавай каронай, надпісам «Міндоўг» і лічбамі «1253—2003». Помнік можна ўсталяваць тварам да замку ў сквэры на цэнтральным пляцы Наваградку.

Праект І.Чарнякевіча больш сымбалічны: стылізаваная вежа-данжон, зробленая з кавалку трубы вялікага дыямэтру; у сьценках мусяць быць прарэзаныя выявы мяча, крыжа, кароны, надпіс «Міндоўг» і лічбы «1253—2003». Вежу трэба зарыентаваць па сонцы, каб у тую гадзіну, калі адбывалася каранацыя, скрозь прарэзаныя насупраць крыж і карону праходзіў сонечны прамень. Месца ўсталяваньня — сквэр ля касьцёлу сьвятога Міхала.

Праект В.Гіголы алегарычна адлюстроўвае закладаньне падвалінаў беларускай дзяржаўнасьці (недабудаваны мур і чатыры кутнія камяні вакол крыжа).

М.Купава ацаніў пецярбурскія праекты крытычна: «Думаю, нам тут удасца стварыць штосьці лепшае. Мы таму і праводзім выставу Саюзу мастакоў, прымеркаваную да гэтага юбілею, каб зьявіліся вартыя творы».

«Прапановы пецярбурскіх беларусаў вартыя ўвагі як адбітак пэўнай грамадзкай думкі, — лічыць мастацтвазнаўца Пётра Васілеўскі. — Але прафэсійныя пытаньні павінны вырашаць прафэсіяналы».

На думку мастацтвазнаўцы Сяргея Харэўскага, праблема ня столькі ў тым, як будзе выглядаць помнік Міндоўгу, колькі ў тым, што будзе ведаць пра караля грамадзтва: «Калі герой не асэнсаваны нацыяй, не ўвайшоў у народную сьведамасьць, то спробы мастакоў будуць выглядаць прафанацыяй».

«Ёсьць небясьпека, што, узяўшыся за вобраз Міндоўга, скульптары паспрабуюць рамантызаваць яго, — згаджаецца П.Васілеўскі. — Так і бачыш таго князя высакародным рыцарам з каронаю на галаве, мячом у руцэ і «Пагоняю» на тарчы. Хацелася б, каб пад гэтым жалезьзем не пахавалі чалавека, супярэчлівую асобу з драматычным лёсам. Каб форма ня зьела зьмест.

Лепей бы мэмарыял у Наваградку стаўся ня помнікам Міндоўгу, але помнікам каранацыі. Асьвечаная Рымам карона на галаве беларускага ўладара — гэта ўкаранаваная Эўропаю Беларусь. Сам Міндоўг — ня больш чым статыст гістарычнай сцэны. Было б лягічна, каб у кампазыцыі помніка Міндоўг успрымаўся прыдаткам да кароны. Укаранаваны ня князь, але Беларусь-Літва».



Праект І.Жураўскага — узброены рыцар зь лятэранскім крыжам на грудзях, які мусіць стаяць на невысокім пастамэнце зь неапрацаванага каменю.

Ідэі генэруюцца. А што ж з увасабленьнем? На лісты, разасланыя аргкамітэтам сьвяткаваньня ў Міністэрства культуры, Саўмін, іншыя інстанцыі, што загадваюць вырабам і ўсталяваньнем помнікаў, адказу пакуль няма. Загадчык аддзелу культуры Наваградзкага гарвыканкаму Аляксандар Крашына ўвогуле кажа, што ніякіх зваротаў не атрымліваў: «Мы чулі, што аргкамітэт прыняў нейкую адозву, але ж гэта было бяз нашага ўдзелу. Для нас самае галоўнае — правесьці міжнародную навуковую канфэрэнцыю, якую нам дапамагае арганізоўваць Акадэмія навук. Па выніках канфэрэнцыі выдадзім зборнік працаў — гэта і будзе вынік на гады». Паводле словаў А.Крашыны, ідэя пастаноўкі помніка заўчасная, бо... «пакуль што няма ўмоваў для гэтага».

**А.В.**




## 358 паэтаў

Пабачыла сьвет анталёгія беларускай паэзіі «Краса і сіла», укладзеная Міхасём Скоблам. Якасьць выданьня адпавядае назьве. Дабрэзны фаліянт пад 900 старонак у цьвёрдай вокладцы зьмяшчае творы 358 паэтаў і паэтак — ад Старога Ўласа да Вольгі Гапеевай. «Анталёгія — суб’ектыўная!» — папярэджвае ўкладальнік. Пытайцеся ў кнігарнях.

IN MEMORIAM

## Алег Табола



3 красавіка ў Менску памёр Алег Табола. Ён ніколі ня скардзіўся, але блізкія ведалі, што ён цяжка хварэе. Даваліся ў знакі восем гадоў сталінскіх лягераў, атрыманых за ўдзел у Саюзе беларускіх патрыётаў — арганізацыі, што аб’яднала студэнтаў Пастаўскае ды Глыбоцкае настаўніцкіх вучэльняў.

Яго сябрам было вельмі ўтульна зь ім. Ён імгненна заўважаў, у каго клямка ў дзьвярах хутка адваліцца, у каго цячэ кран, хто хворы й ня можа схадзіць у краму, у каго цячэ страха, у каго пагнілі драбіны, а ў склеп трэба засыпаць бульбу. Ён заўсёды дапамагаў. Гародніна зь лецішча, мёд ад уласных пчол — усё ішло сябрам. І кожны разам з падарункам атрымліваў часьцінку чалавечага цяпла.

Бывай, наш браце, сябра, бацька. Такім ты быў для нас.

**Зінаіда Тарасевіч**



IREX-PROMEDIA

## Красавік

У красавіку першыя кветкі красуюць, што й дало назву другому месяцу каляндарнай вясны. Менавіта ў гэты час распускаюцца першыя бутоны гусінае цыбулі, курасьлепу, чубаткі, лотаці. Вясна набірае моц. Цягам красавіка сярэднясутачная тэмпэратура паветра павялічваецца на 7—10 градусаў. Такое адбываецца толькі гэтай парой. Анамальным быў 1929 г., калі на большай частцы Беларусі стаялі маразы да -15…-17°C . Устойлівае сьнегавое покрыва трымалася амаль да канца месяца. Збожжа пасеялі позна, як ніколі. Лета таксама было «ніякае», у выніку — неўраджай.

А вось у цёплыя вёсны ў другой і трэцяй дэкадах паўднёвыя паветраныя масы прыносяць амаль летняе надвор’е: ад +26 на ўзвышшах Меншчыны да +31°C на поўдні Палесься. Такое здараецца вельмі рэдка. Шматгадовыя назіраньні сьведчаць, што пасьля вельмі цёплага красавіка травень звычайна бывае халаднейшы за норму.

У паўночнай частцы краіны максымальнага разьвіцьця сягае эразійная дзейнасьць. Адбываецца гэта на ўзвышшах з прычыны шпаркага сьнегараставаньня і амаль поўнай адсутнасьці расьліннасьці. Веснавыя воды зносяць глебу тонамі.

Красавік — самы сухі месяц за ўвесь цёплы пэрыяд. Колькасьць ападкаў зрэдку перавышае 50 мм (гэта 1—2 добрыя ліўні). Мажлівае выпарэньне, асабліва на поўдні, перавышае гэты паказьнік. Вельмі важны момант, які адбываецца звычайна паміж 1 і 20 красавіка на ўсёй тэрыторыі Беларусі, — пераход сярэднясутачнай тэмпэратуры цераз +5°C. Гэтую лічбу бяруць за пачатак сельскагаспадарчых работ. Спачатку ярыцы, потым бульбы, морквы і іншага. Зважаюць таксама на стан і тэмпэратуру глебы.

У жывой прыродзе вялікія зьмены. Прылятаюць апошня птушкі, прачынаюцца вужакі, барсукі, грызуны. У ласёў ды казуль зьяўляецца патомства, тым часам у малых вавёрак ды ваўчанят ужо расплюшчваюцца вочкі. Ідуць на нераст шмат якія віды рыб. Актыўнае жыцьцё пачынаецца.

**Юры Фралоў**

# Будучы японскі прэм’ер ненавідзіць ЗША.

# І Японію таксама

**Губэрнатар гораду Токіё Сінтара Ісіхара карыстаецца любой нагодай, каб жорстка пакрытыкаваць японскіх палітыкаў. Але, нягледзячы на ўсе ягоныя напады, ён сам застаецца сапраўдным японцам.**




Губэрнатар Токіё пад’яжджае. Невялічкая група модна апранутых маладзіц — валасы ва ўсіх рудыя — ужо кучкуецца на тратуары. Паркуюцца два чорныя лімузыны. Калі зьяўляецца губэрнатар — 70-гадовы статны мужчына, дзеўкі пачынаюць вішчаць так, як быццам ён — рокзорка.

У аднастайным сьвеце японскай палітыкі Сінтара Ісіхара, старэйшы брат японскага кінакуміра Юдзіра (героя-палюбоўніка, японскага клона Джэймза Дына), — сапраўдная зьвяга. Ісіхара — не шараговы палітык-кар’ерыст. Ён быў карэспандэнт-міжнароднік, пісьменьнік, ляўрэат літаратурных узнагародаў і, хоць сам старанна адбрэхваецца, верагодна, будучы прэм’ер-міністар.

Фарсун Ісіхара зваяваў славу й немалую папулярнасьць сваімі вельмі не японскімі паводзінамі, пераўзышоўшы нават прэм’ера Дзюніціра Кайдзумі, які мае прычоску на манер Элвіса Прэсьлі. Ісіхара кажа тое, што думае. Ён высакамоўны й напышлівы. Ён, як блазан з п’есаў Шэксьпіра, часта адкрывае схаваную праўду, наўпрост гаворыць пра страхі й забабоны, пра якія звычайна маўчыць японскі бамонд.

Мне параілі прыехаць загадзя, каб я мог павітаць губэрнатара ля ўваходу ў «Аза» — шыкоўную італьянскую рэстарацыю, якую ён выбраў для нашай сустрэчы. Пасьля фармальнага вітаньня ён падымаецца па лесьвіцы ў прыватную залю, зарэзэрваваную для губэрнатара й ягонае почты.

Ягоныя першыя словы гучаць па-ангельску. Робячы ненатуральны твар, калі наш фатограф здымае яго, ён жаліцца на неабходнасьць насіць гальштук — «атрыту заходняй цывілізацыі». Магчыма, гэта было завучана, але я ўсё адно пасьпешліва шукаю свой нататнік.

У адрозьненьне ад мінімалістычных пакойчыкаў *татамі* ў тыповых японскіх рэстарацыях, наша заля аформленая пампэзна, у стылі канца XIX стагодзьдзя — з срэбнымі талеркамі на стале й замалёўкамі на ружовых сьценах. Я ўслых дзіўлюся, што знакаміты нацыяналіст выбраў такую дэкадэнцкую эўрапейскую рэстарацыю. Адзін зь ягоных памочнікаў тлумачыць, што гэта было зроблена, каб зьдзівіць мяне; сам Ісіхара кажа, што ўчора ён еў стравы японскай кухні, а сёньня захацела перамены.

Мы сядаем. Як і многія ягоныя суайчыньнікі, губэрнатар аддае перавагу размове праз перакладчыка, хоць сам няблага валодае ангельскай. Ён кажа, што стаміўся (і зьнэрваваўся) пасьля ўчорашніх пяці сэтаў гульні ў тэніс. Замаўляе комплексны абед, сапраўдную фээрыю з васьмі страваў, сярод якіх «паста» ці не з найлепшымі ў Японіі вустрыцамі з Касагавы — роднага гораду шэф-кухара.

Прывязаўшы душу невялічкім «рызота» з дарункамі мора, выкладзеным на вялікую талерку з такой далікатнай сымэтрыяй, на якую здольныя толькі японцы, я вырашаю ўсё ж такі заняцца сваёй справай. Якія ўспаміны засталіся ў Ісіхары ад вайны й амэрыканскай акупацыі? Пытаньне мае грунт. Многае ў паводзінах Ісіхары тлумачыцца пачуцьцём прыніжэньня той паразай. У сваёй кнізе «Японія, што можа сказаць «не»» ён заклікае свой народ паўстаць супраць «амэрыканскай гегемоніі», у прыватнасьці ў гандлі.

«Я памятаю, як у дзяцінстве бег па бульбяным полі, шукаючы ратунку ад бомбаў, якія скідаў амэрыканскі самалёт, — кажа Ісіхара, прыгадваючы падзею, што скалечыла ягонага сябра. — Самалёт ляцеў нізка, і пілёт мусіў бачыць, што кідае бомбы на дзяцей».

Памятае Ісіхара й лёсавызначальны момант гісторыі Японіі XX ст. — прамову імпэратара аб капітуляцыі. Памятае тыя словы, што далёталі праз радыёперашкоды. Упершыню японцы чулі, як імпэратар размаўляе. «Мне здалося, што ягоны голас быў надта высокі й гучаў па-жаночы, — грэбліва кажа Ісіхара. — Такі каціны».

Ісіхара пярэчыць агульнаму меркаваньню, што японцы назаўжды адракліся свайго мілітарызму ледзь не назаўтра пасьля вайны. «Мы ганарыліся гэтай вайной! — кажа ён, ляснуўшы кулаком па стале так, што кавалачкі лёду ў ягоным шэры зазьвінелі. — Дабрабыт Эўропы грунтаваўся на эксплюатацыі прыродных рэсурсаў ейных калёніяў і іх таннай працоўнай сіле, на рабстве. Так казаў яшчэ Ленін, і я зь ім абсалютна згодны!»

> Ісіхара пярэчыць агульнаму меркаваньню, што японцы назаўжды адракліся свайго мілітарызму. «Мы ганарыліся гэтай вайной!» — кажа ён.

Ужо не ўпершыню Ісіхара — чалавек, які шчодра перасыпае свае прамовы антыкамуністычнымі лёзунгамі, не раўнуючы шэф-кухар, што не пашкадаваў спэцыяў для свайго выдатнага *carpaccio di pomodoro*, — цытуе правадыра ўсіх працоўных. Пазьней ён узгадвае словы Наама Чомскага пра тэрарыстычную атаку 11 верасьня як у пэўнай ступені помсту за бамбаваньне амэрыканцамі фармацэўтычнага заводу ў Судане.

Пад спагеці з вустрыцамі Ісіхара распавядае гісторыю, што здарылася ў 1946 г. Яму, 14-гадоваму, п’яны амэрыканскі жаўнер шпурнуў у галаву марозіва-эскімо на палачцы. «Тады хадзіла шмат чутак, што ён забіў мяне, а насамрэч ён мяне толькі ўдарыў», — кажа губэрнатар. Я не адразу зразумеў, што ён усё яшчэ гаворыць пра эскімо.

Колісь ён распавядаў пра інцыдэнт амэрыканскаму кангрэсмэну, і той запытаўся, ці быў той вайсковец нэграм. Гэта перакanала Ісіхару, якога самога часта вінавацяць у расізьме, што амэрыканскае грамадзтва поўнае расавых забабонаў. На самай справе жаўнер з марозівам быў бляндынам з блакітнымі вачыма, трыюмфальна кажа Ісіхара.

«Японія, што можа сказаць «не»» была напісаная ў канцы 1980-х, калі краіна перажывала ўздым. У кнізе Ісіхара заклікаў Японію выкарыстоўваць сваю тэхналягічную перавагу дзеля стратэгічнага ўплыву й сцьвярджаў, што амэрыканскі капіталізм можа шмат чаму навучыцца ў Японіі. Я пытаюся, ці не зьмяніў ён свой пункт погляду з таго часу, улічваючы эканамічны рост у ЗША й застой японскай гаспадаркі. Нягледзячы на ўсю тэхналягічную перавагу апошняй, менавіта амэрыканцы дасягнулі найвялікшых посьпехаў у біялягічных ды інфармацыйных тэхналёгіях за апошнія дзесяцігодзьдзе.

«Японскія тэхналёгіі былі ў дзесяць разоў больш карысныя падчас вайны ў Пэрсыдзкай затоцы, чым разьмяшчэньне там 80 000 брытанскіх жаўнераў», — адказвае ён, заядаючы мікраскапічныя бульбачкі сакавітай ялавічынай. «Мікрачыпы гульнёвай прыстаўкі «Sony Playstation-2» маюць 128-бітавую памяць, а тыя, што амэрыканцы ставяць на свае касьмічныя караблі, — усяго 54 біты, — працягвае ён, адпраўляючы ў рот бульбіну за бульбінай. — Японцы ня ведаюць пра стратэгічны патэнцыял сваіх тэхналёгіяў. Яны не ўсьведамляюць, што гэтыя тэхналёгіі вельмі каштоўныя для ЗША, Кітаю й Паўночнай Карэі».

Ён жорстка крытыкуе цяперашніх палітыкаў, якія, зь ягоных слоў, не разумеюць правілаў міжнароднай дыпляматыі, ня маюць найменшага ўяўленьня, як выцягнуць Японію з эканамічнай дэпрэсіі. «З краінаў я найбольш у сьвеце ненавіджу не ЗША, а Японію».

Ці мог бы ён палепшыць сытуацыю? Часта выказваецца думка, што калі прапанаваная Кайдзумі праграма радыкальных эканамічных рэформаў забуксуе праз бясконцую бюракратычную цяганіну — а гэта больш чым рэальна, — то расчараваныя выбаршчыкі могуць сасьпець для нацыяналізму, прапанаванага Ісіхарам. «У палітыцы ўсё можа здарыцца, і я ня ведаю, што нам рыхтуе прышласьць, — кажа ён, даючы рады булачцы з шакалядам. — Я спрабаваў стаць прэм’ерам, калі быў у парлямэнце, але цяпер ужо гады ня тыя».

Я кажу, што гады — не бяды, у думках узгадваючы цэлую плеяду японскіх прэм’ераў-старцаў. Акрамя таго, у Ісіхары яшчэ стае сілаў, каб гуляць у тэніс па пяць сэтаў запар.

«Гэта сакрэт», — перабівае ён. Я спачатку не зразумеў, падумаў, што яму ня хочацца дзяліцца сакрэтам сваёй фізычнай сілы з палітычнымі апанэнтамі. Аказалася ж, не, проста, нягледзячы на ўсю ягоную антыпонскасьць, ён застаецца японцам вылітым. «Калі ласка, зразумейце мяне — проста я ў суботу цэлы дзень працаваў. Таму ў панядзелак я дазволіў сабе зрабіць выходны».

**Паводле «Financial Times»**

# Трагедыя ў фантастычных апавяданьнях

**На Малой сцэне Купалаўскага — прэм’ера монаспэктаклю «Беларусь у фантастычных апавяданьнях» паводле Яна Баршчэўскага.**

Пры ўваходзе, у дадатак да праграмкі, давалі бясплатную комплексную рэкляму Менскага заводу шампанскіх вінаў, якойсь друкарні ды выставы фатамайстра Артура Прупаса, аздобленую здымкам трох дзявуль пад парасонам. Невядома, ці ўкладаюцца іх выявы ў рамкі дазволеных Дзяржкамдрукам 30% аголенага цела. Адны ногі пацягнуць працэнтаў на шэсьцьдзесят...

Прыцемненая сцэна абстаўленая вельмі ўтульным хатнім рэквізытам: калядная зорка, газьнічка, жыта ў плеценых кашах і мяхох. У адным, праўда, былі семкі. Ці то чорнае жыта? Прыгожы вобраз.

Пакуль чакалі пачатку дзеі, згадаўся Завальня-Гасьцюхін з аднайменнага фільму — перабольшана патасны, нібы нежывы. Відавочна не адчуваў рэаліяў, якія мусіў увасабляць. Заставалася гаварыць пра маральнасьць. Дый ня дужа пераконліва глядзелася, як і фальшывая барада ды расейская мова беларускага шляхціца. Дальнабойшчык з Гасьцюхіна лепшы.

Новы «купалаўскі» Завальня і ўсе-ўсе-ўсе ў адной асобе актора Генадзя Давыдзькі — а ён і апавядальнік, і прыслужнік, і сам пан, і кожны з гасьцей — ня маюць у характары ані сьледу фанабэрыі. На шчасьце. Ані сьледу шляхецкасьці — на жаль.

Вобразы глыбока народныя, бурлескныя — аж да невялікай татуіроўкі на руцэ артыста. Яны пахехекваюць, пасопваюць, прытупваюць, хітра адцягваючы глядацкую ўвагу на гэтыя свае выкрунтасы. А актор, нібы між іншым, перасыпае жыта, сьвечкі запальвае, баіць рознымі галасамі пра Белую Сароку, зграі ваўкалакаў, чарнакніжніка. І пры канцы як на талерачцы падае прыціхлым гледачам глыбачэзную, прыхаваную дагэтуль, трагедыю. Маўляў, то ж бо — у краі «жыцці весела, толькі некаму». Згадваецца колісь вучанае: Белая Сарока — правобраз царыцы Кацярыны. Хто ж тады яе служка пан Скамарох? Адказ ляжыць на паверхні. І няма ў фінале гераічнае сьветліні «Тутэйшых». Няма надзеі. Толькі цёмны одум.

У аксамітнай фіялетавай цемры Малой сцэны (нізавошта ня скажаш, што за сьцяной — кавярня ў стылі «залатых сямідзясятых», з абкладзенымі «кабанчыкам» сьценамі) асабліва магутна, асабліва да месца гучаць сьпевы Івана Кірчука. Яшчэ адна выйгрышная рэжысэрская знаходка.

Доўгае спакойнае жыцьцё пастаноўцы можа гарантаваць і тое, што, у адрозьненьне ад дзясяткаў іншых монаспэктакляў, гэты — нядоўгі. Гадзіна зь нечым. Наступны раз яго пакажуць 25 красавіка.

**Сяргей Мікулевіч**

# Сьвіранскія крэскі



АНАТОЛЬ КАЛЯДА

Кажуць: адзін у полі не ваяр, не ваяка, не змагар. Мо ў якіх народаў і не змагар. Але ў беларусаў і адзін можа зрабіць цуды. Кажучы гэтак, я найперш згадваю віленскага беларуса Юрася Гіля (на здымку ў цэнтры). Колькі гэты апантаны самаахвярнік зрабіў дзеля ўшанаваньня памяці слыннага нашага літаратара і адваката Францішка Багушэвіча ў падвіленскіх Сьвіранах! Гэта з клопату Юрася Гіля і ягоных аднадумцаў за апошнія два гады былі ўсталяваны на радзіме аўтара «Дудкі Беларускай» аж дзьве мэмарыяльныя памяткі. А трошкі раней у суседзкіх зь Сьвіранамі Савічунах імем песьняра была названая адна з вуліц, якраз тая, што паглядае на Сьвіраны.

Колькі высілкаў гэтае ўшанаваньне каштавала Юрасю! Не забывайма, радзіма Францішка Багушэвіча — у іншай дзяржаве. Тым ня менш Юрасю Гілю шмат што ўдаецца. Бо ёсьць апантанасьць, глыбокае разуменьне несправядлівасьці. Гэта ж трэба — гэтулькі гадоў беларусы і літоўцы пражылі ў адной дзяржаве і нідзе на Віленшчыне за гэтыя гады не было ўшанавана імя таго, хто вярнуў краю генную памяць. Дакор гэты не Літве, не літоўцам. Дакор гэты найперш нам самім. Гэта нашы літаратары не паклапаціліся, не парупіліся, хоць магчымасьці нібыта за супольным часам былі найлепшыя.

Сёлета Юрась разам з сваімі аднадумцамі зрабіў яшчэ адзін крок для ўшанаваньня ў Сьвіранах нашага клясыка. Выраблены крыж у гонар нашага Прарока. Цяпер узгадняюцца пытаньні яго ўсталяваньня і асьвячэньня (на жаль, літоўскія ўлады не заўжды ахвотна ідуць на ўсталяваньне знакаў з надпісамі на замежных мовах).

…Некалі ў Сьвіранах віравала духовае жыцьцё. Тут жылі колісь сьвятары. Тут была каплічка. На ўсіх расстайных дарогах стаялі крыжыабярэгі. Але мінулае стагодзьдзе зруйнавала ў Сьвіранах усё, што толькі нагадвала пра Хрыста і ягоныя сымбалі. І от з рупнасьці віленскіх беларусаў у Сьвіранах паўстане Сьвяты Крыж новага часу.

Юрась Гіль зрабіў на Віленшчыне дзеля ўшанаваньня Багушэвічавай постаці тое, чаго да яго ніхто ня змог. Беларуская грамадзкасьць павінна неяк заўважыць гэтую Юрасёву самаахвярнасьць.

**Уладзімер Содаль**

## АБВЯРЖЭНЬНЕ

**29 сакавіка 2002 г. у газэце «Наша Ніва» была надрукавана карэспандэнцыя Адама Глёбуса «Васілеўская і спадчына». Я пра гэту публікацыю выпадкова пачула толькі праз год. (Мне ніхто не сказаў тады, бо яшчэ не прайшло і сарака дзён пасьля сьмерці майго мужа, П.Васілеўскага. Мяне шкадавалі.)**

Таму адказваю на гэты опус цяпер.

Першае: пра існаваньне нейкай «Сарачкі» я ўпершыню дазналася з публікацыі Глёбуса. Да гэтага ні я, ні мая маці пра яе ня ведалі і ніколі ня чулі. Бо яе не было.

Другое: нягледзячы на тое што мая маці ў час вайны хавала ад немцаў габрэек, ён прыпісвае ёй словы, якіх яна ніколі не гаварыла: «Ну калі ўжо **наша жыдоўка** (вылучана мною — Г.В.) выпрасіла багацьце сваёй Сарачцы, то і я, Галя, папрашу грошай для цябе».

Лічу ўсе гэтыя словы ня толькі абразай сьветлай памяці маёй маці — разумнай, інтэлігентнай і вельмі добрай жанчыны, але і абвінавачаньнем яе ў антысэмітызьме.

Трэцяе: спадчыны я не атрымлівала. У 1966 г. (Глёбусу тады было 8 гадоў) яе атрымала мая маці — Банат Марыя Адамаўна. Кватэры мы таксама не куплялі, і «фантастычнай», паводле Глёбуса, сумы не існавала.

І апошняе: Глёбус піша пра гэтую гісторыю, нібыта *гэта я пераказваю*. Ніколі Глёбусу я нічога не пераказвала і дазволу на публікацыю яго хлусьні таксама не давала.

**Галіна Васілеўская, Менск**

**Ад Рэдакцыі.** Перапрашаем Галіну Васілеўскую. Хацелі б толькі адзначыць, што «Сучасьнікі» Адама Глёбуса друкаваліся як **літаратурны твор**, што адлюстроўвае па-мастацку пераасэнсаваную рэчаіснасьць, а не як журналісцкі матэрыял.

# Маякоўскі з аркестрам

Які б кульбіт ні выкінуў кумір, думаецца, што прыхільнікі яго падтрымаюць. Так і выйшла 2 красавіка на прэзэнтацыі новай праграмы Зьмітра Вайцюшкевіча пад назвай «В.Маяковский. Часть 1». Тое, што адзін з найлепшых нашых музыкаў знаходзіцца заўсёды ў пошуку, вядома ўсім: рэпавыя чытанкі ў «Палацы», электронныя экспэрымэнты ў «Крыві», «вяртаньне да каранёў» на пачатку сольнай творчасьці... Сёлета Зьміцер скіраваў свой погляд у бок савецкай паэзіі.

Але цана квітка (9000 руб.) выявілася завялікай для расейскамоўнай праграмы. Заля Тэатру юнага гледача была запоўненая толькі на чвэрць.

Вайцюшкевіч, выйшаўшы на сцэну, адразу зазначыў, што інтэграцыйныя працэсы з гэтым праектам ніяк не стасуюцца і папрасіў прабачэньня, калі некага новыя песьні шакуюць: «Гэта мой погляд на вершы Маякоўскага — паэта сусьвету найперш».

Публіка экспэрымэнты Вайцюшкевіча збольшага падтрымала, хоць і аднеслася да іх з жартам. Так, якісьці дзяцюк першы нумар праграмы «Письмо к любимой Молчанова» назваў «расейскай кабацкай песьняй», а Алесь Камоцкі ня ўбачыў у новым цыкле актуальнасьці.

Кампазыцыі («Бруклинский мост» і «Красавица») гучалі няблага: зьедлівая паэзія Маякоўскага тут арганічна дапоўнілася музыкай «WZ-orkiestra». Цікава, што, у адрозьненьне ад дзьвюх папярэдніх сольных праграмаў, у гэтай Вайцюшкевіч не выяўляецца як мультыінструмэнталіст — толькі сьпявае.

Невядома, ці будзе «В.Маяковский» мець такі посьпех, як, прыкладам, ранейшыя Вайцюшкевічавы «Баляды», што намінуюцца на «Найлепшы альбом 2002 году».

**Сяргей Будкін**

# Пушкін у Маскве

З 26 сакавіка ў Маскве праходзіць выстава мастака Алеся Пушкіна «А.Пушкин и его Беларусь», прысьвечаная 85-м угодкам абвяшчэньня незалежнасьці БНР. На яе адкрыцьцё прыйшлі шматлікія прадстаўнікі беларускай дыяспары, а сярод іх — прафэсар Яўген Шыраеў, былы дысыдэнт Міхась Кукабака, лідэр мясцовага беларускага руху Генадзь Лех ды інш. Праігнаравалі запрашэньне касманаўт Уладзімер Кавалёнак і журналіст Павал Шарамет. У сапраўдны пэрформанс ператварылася спроба А.Пушкіна запрасіць на выставу пасла Беларусі ў Расеі Ўладзімера Грыгор’ева. Само зьяўленьне мастака ў пасольстве, дзе ніхто не размаўляе па-беларуску, надоўга запомніцца дыпляматычным пасланцам нашае краіны.

**Прысутны**



Натальля Судлянкова

Эмігранцкія гісторыі

# Цешыцца з жыцьця


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Яны мала вылучаліся з агульнага лягернага соцыюму. Дый гісторыя іхная была бясконца тыповая. Тым яны і былі цікавыя. Мужа звалі Мікалай, жонку, якая пакутавала на якіясьці артыкуляцыйныя праблемы, — Валя.

Да засваеньня прафэсіі ўцекачатуруста Мікалай працаваў на нейкай ЦЭЦ ва Ўкраіне. Жыў сабе ды жыў, пакуль зьмей-спакусьнік — прыяцель — не намовіў паехаць па машыны ў далёкую Нямеччыну. Пасьля сямейнай нарады Мікалай наважыўся.

Але каварны зьмей-спакусьнік, калі яны даехалі да Польшчы, сказаў: «Слухай, а навошта нам у Нямеччыну? Паехалі ў Бэльгію, прытулку папросім...» Што гэта такое, было не зусім зразумела, але Мікалай, упершыню ў жыцьці трапіўшы за мяжу і адурэўшы ад спакусаў, прыняў рашэньне бяз роздуму.

Хутка ён выклікаў да сябе жонку з дваімі дзецьмі і пачаў, як ён сам узахлёб расказваў, «цешыцца з жыцьця». Дапамога на кожнага складала каля 300 даляраў. Яны зьнялі на чацьвярых аднапакаёўку за 350 даляраў і працягвалі цешыцца з жыцьця.

Мучыла толькі загана накапляльніцтва. Відэамагнітафон знайшлі на сьметніку, тэлевізар — каля чыйгосьці дому, адзін знойдзены імі мабільны тэлефон нейкі бэльгіец згубіў на вуліцы, другі — у трамваі. На рынку ўвечары ежу ім аддавалі задарма: бэльгійцы чамусьці не ядуць учорашняй рыбы і зьвялага зяленіва.

Паўнату адчуваньня жыцьця давяршала магчымасьць наведваць курсы францускай мовы за кошт гасьціннага бэльгійскага боку. Але Мікалай згадвае гэтую магчымасьць са сьмехам: «Слухай, а навошта туды хадзіць было? Мы ж з жыцьця цешыліся...»

Уцеха доўжылася 9 месяцаў. Прыйшоўшы чарговым разам пазначыць сваю прысутнасьць у Брусэлі, яны не маглі й двух словаў зьвязаць па-француску. Някемлівыя паліцыянты чамусьці катэгарычна адмаўляліся разумець украінскую і цешыцца з жыцьця разам зь Мікалаем,Валяй і іхнімі сынамі. Ім прапанавалі пакінуць Бэльгію, бо справа аб наданьні ім прытулку нават ня будзе разглядацца.

Вяртацца дахаты было цяжка. Рукі адцягвалі торбы, запоўненыя магнітафонамі, відэамагнітафонамі ды іншымі сьведчаньнямі радаснага жыцьця. Ва Ўкраіне так радасна ўжо не было. Трэба было працаваць, ежы бясплатна не давалі, шэнгенскай візы — таксама.

Таму яны і паехалі ў Чэхію, куды на той момант віза была непатрэбная. І папрасілі прытулку.

# Доктар Мэнгеле

Віктар упершыню ўбачыў Прагу з вышыні вежы савецкага танка ў 68-м. Ён застаўся ў войску, дарос да чыну маёра і пасьля выхаду на пэнсію вырашыў папрасіць палітычнага прытулку ў Чэхіі. І ў лягер папрасіўся менавіта той, што быў непадалёк ад былога месца ягонай службы. У глыбіні пэнсіянэрскай душы варушылася штосьці такое, незразумелае. З аднаго боку, гэта былі ўспаміны пра любімага сябе, маладога, упэўненага і перакананага, што чэхі — аблудныя істоты, якім з дапамогаю танкаў можна і трэба растлумачыць перавагі сацыялістычнай сыстэмы.

Зь іншага боку, ён сам не разумеў, чаму ж на пэнсію сюды прыехаў.

Вось так, змучаны сумневамі, і жыў ён бязь іншых турботаў у лягерным камунізьме. Пакуль не запаліўся ў яго нэрв твару. Перакошаны ад болю, прыйшоў Віктар да лягернага лекара. Размахваючы вольнай ад падтрымліваньня левай шчакі правай рукой, адстаўнік спрабаваў патлумачыць міламу сівому дзядулю-доктару, што надта ж твар з галавой разам баляць.

І пачуў у адказ: «У нас у 68-м яшчэ ня так усё балела. У мяне лекі скончыліся…»

«Пайшла ты, любая, пад гоман жоўтых сосен», іншымі словамі.

Гэта быў чэскі «Доктар Мэнгеле» — легендарнае ўвасабленьне абсалютна шчасьлівага чалавека. Ён урэшце рэалізаваўся ў сваёй доўгай стрымліванай нянавісьці да савецкіх акупантаў. Лепшага месца, чым лягер уцекачоў, для гэтага знайсьці было немагчыма. Няважна, колькі гадоў меў і якой нацыянальнасьці быў выхадзец з былой адной шостай часткі сушы, які прыходзіў па дапамогу. Вышэйшай за прысягу Гіпакрата для «Доктара Мэнгеле» была нянавісьць.

Наймілейшай і найдабрэйшай бабулі-уйгурцы, якая пражыла ўсё сваё жыцьцё ў Сібіры, эскуляп выдаляў ліпомы на галаве без адмысловага абязбольваньня проста ў сваім кабінэце. Яе ўнуку, 22-гадоваму хлопцу, які пра 68-ы ўжо нават у кніжках не чытаў, — выцягваў урослы ў нагу пазногаць без замарозкі. Беларуску Тацяну адмовамі паслаць да лор-лекара давёў да запаленьня сярэдняга вуха…

Працягваць можна бясконца. Некалькі гадоў запар доктар Мэнгеле самарэалізоўваўся напоўніцу, пакуль сёлета, абложаны праваабаронцамі і лістамі скалечаных уцекачоў, МУС Чэхіі не пачаў шукаць іншага лекара.

А Віктар прытулку так і не атрымаў…

НАТАТКІ БУКІНІСТА

# Plica polonica

**Нядаўна прагледзеў бацькаву спадчыну — кнігі нямецкіх клясыкаў, друкаваныя гатычным шрыфтам. У адной зь іх знайшоў рэдкі падарожны нарыс Гайнэ «Пра Польшчу», дзе ён апісвае сваё падарожжа па землях былой Рэчы Паспалітай. Адбылося яно ў 1822 г. і доўжылася некалькі месяцаў.**



Гайнэ езьдзіў па акупаванай Прусіяй частцы, гасьцюючы ў магнатаў і шляхты, але бываў, як піша сам, і на землях, акупаваных Расеяй, — у Беларусі. Нарыс Гайнэ прачытваецца сьвежа і надзённа. У ім ёсьць спажыва ня толькі для літаратуразнаўца, але і для этнакультуроляга, гісторыка. Так Гайнэ апісвае тыповага селяніна: «Добра збудаваны, каржакаваты, салдацкае выпраўкі, звычайна зь бялявымі валасамі; у большасьці валасы спадаюць вольнай хваляй на плечы. У шмат якіх сялян у доўгіх валасах вельмі пацешная хвароба «Plica polonica», альбо «вісьлянская коска», якой і мы будзем блаславёныя, калі ў нямецкіх паветах распаўсюдзіцца мода на доўгія валасы».

Гайнэ фіксуе аселых у Польшчы габрэяў як праслойку між магнатамі і прыгоннымі, піша пра канкурэнцыю зьбяднелай шляхты і габрэяў. Ён фіксуе адрозьненьні між габрэямі прускай і расейскай частак Польшчы: у расейскай ім дазвалялася займаць любыя дзяржаўныя пасады, там больш габрэяў жыло з працы на зямлі. А ў нямецкай частцы яны займаліся рамесьніцтвам, вінакурствам, гандлем, былі аканомамі ў маёнтках.

У падарожных нататках чытаецца незадаволенасьць Гайнэ кансэрватызмам і ўціскам свабоды ў роднай Прусіі. Юдэі там ня мелі шанцаў зрабіць кар'еру, таму Гайнэ ўрэшце і пахрысьціўся. І ўжо жывы раманты-суб'ектывіст адчуваецца ў наступным апісаньні: «Выгляд польскага габрэя жахлівы. Мяне праціна-юць дрыжыкі, калі я ўспамінаю, як за Мэзэрыцам пабачыў польскую вёску, населеную зболышага габрэямі. Але агіда неўзабаве была выцесьненая спачуваньнем пасьля таго, як я бліжэй разгледзеў стан гэтых людзей і пабачыў дзіркі, бы сьвіныя клецi, дзе яны жывуць, шалпочуцца, моляцца богу, круцяць такі-сякі маленькі шахер-махер — у нэндзы».

Гайнэ заўважае, што зь Нямеччыны на ўсход мігравалі ня толькі габрэі, але і нямецкія рамесьнікі. Магутны пласт германізмаў у будаўнічай тэрміналёгіі беларускай мовы пацьвярджае гэта. Або згадаем нямецкія пасяленьні пад Берасьцем, лютэранскую кірху ў самім горадзе па вул.Маркса, у якой саветы зрабілі кінатэатар, а цяпер месьціцца рэклямнае агенцтва.

Каштоўнымі падаюцца назіраньні лібэрала Гайнэ што да нораваў польскіх магнатаў і сялян. «Свабода большасьці палякаў — гэта ня боская, не Вашынгтонава свабода; толькі малая частка, толькі такія людзі, як Касьцюшка, зразумелі апошнюю і спрабавалі яе распаўсюдзіць. Слова «свабода» было адно выбарчым слоганам нобіляў, якія спрабавалі выдраць з каралеўскіх рук як мага больш правоў, каб павялічыць сваю ўладу і тым самым выклікаць анархію. Той прынцып ваяўнічай свабоды, якая нібыта лепшая за спакойнае рабства, падштурхнуў палякаў да пагібелі».

Але, разам з тым: «Любоў да Бацькаўшчыны ў палякаў — вялікае пачуцьцё. Адзін француз, які ня мог зразумець, адкуль столькі любові, аглядзеў змрочную польскую балацянку, калупнуў нагой у балоце і мовіў, са зьдзекам хітаючы галавой: «І гэта вось яны называюць Бацькаўшчынай». Але столькі любові паўстала ня з глебы, а з барацьбы за самастойнасьць, з гістарычных успамінаў і зь няшчасьця».

Пра норавы простага люду Гайнэ піша не без сарказму: «Яго бачаць у вулічнай калюзе, як ён ляжыць раскінуўшыся, а вакол яго хеўра дружбакоў — разглядаюць з шчырай шкадобай, як гэта чалавеку мала трэба. Што гэта за чалавек, калі тры меркі гарэлкі — і з ног! Але ж палякі ў піяцтве нечалавечыя маюць дасягненьні.

…Падбітасьць польскага селяніна пад свайго пана абражае. Ён кланяецца, мала не дастаючы галавой да ног ягамосьці, і прамаўляе формулу «Цалую ногі». Той, хто хоча быць пэрсаніфікацыяй паслухмянасьці, няхай пабачыць польскага селяніна, як той стаіць перад панам: бракуе толькі віхлястага сабачага хваста».

Нарэшце, аўтар прадстаўляе нам цікава-супярэчлівае, калі згадаць патрыятызм палякаў, апісаньне акупацыі і акупантаў: «Аб прускіх вайскоўцах, якія дысьлякуюцца ў гэтай мясцовасьці, няма патрэбы шмат казаць. Яны, як паўсюль, зухаватыя, сьмелыя, ветлівыя, шчырыя і сумленныя. Палякі іх паважаюць, але пра больш цёплае пачуцьцё пакуль няма мовы».

Не пагаджуся і з развагамі Гайнэ пра бібліятэчную справу на землях Рэчы Паспалітай. Як суаднесьці ягонае «існуе ў зародкавым стане» зь бібліятэкай Храптовічаў, з выдавецкімі магутнасьцямі і з наяўнасьцю літаратуры?

Але пры якой-кольвечы нагодзе выдаць больш грунтоўныя, чым ёсьць цяпер, пераклады з Гайнэ ў Беларусі нельга абысьці ўвагай нарыс «Пра Польшчу» як датычны гісторыі нашай Бацькаўшчыны.

**Яўген Бяласін**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

*Мама, з Днём народзінаў!*
*Мы любім цябе.*
*Генадзь, Андрэй і ўсе-ўсе-ўсе.*

**ВІТАНЬНІ**

**Віншуем Андрэя Статкевіча** з Днём нараджэньня, зычым посьпехаў ва ўсіх пачынаньнях і плёну ў творчасьці. ТБМ КП

**У Вовачкі** Аляксандрава Дзень народзінаў! Ура!

**Futbolnyja fanaty** ūsich krainaū dy narodaū abjadnalisia… z nahody narodzinaū hetaha čałavieka

**Табе**, сонца!

**Цікава**, што было сьпярша: ты быў створаны для вясны ці вясна — для цябе?..

**Sp.Uładzimier!** Vaš Dzień narodzinaū dla nas taksama śviata! Vinšujem! (Z Vas — tort.) Usie, chto maje dačynieńnie da Liceju

**Спадара Ўладзімера** віншуюць з Днём народзінаў яго лепшыя сябры: ППРБ, ін, Саруман, вядзьмарка, герцаг, баранэса, оркі

**Спадара Ўладзімера** віншуюць яго найлепшыя ворагі: Горын, Мюнгаўзэн, Толкін, Фрода, Арагорн, Гендальф, Эслан, Люсі

**Віншую** сэкту Віньні з Камаедзіцай. Няхай Віньні заўжды будзе з вамі. Тацяна

**ПАДАРУНАК**

**Прыму** ў падарунак усё, што нешта паказвае, зьвініць ці проста трашчыць. Мне патрэбна ўсё. E-mail: plastuuna@tut.by

**ПРАДАЮ**

**Прадаю** новую клясную мабілу «Nokia-3310», год гарантыі, дастаўка. Т.: (8-0297) 55-16-74

**Прадаю** сотавы тэлефон «Siemens C-45», новы, год гарантыі, дастаўка, вельмі танна. Т.: 282-72-85, (8-0297) 52-14-65

**Прадаю** кампутар б/в, Pentium-200/Voodoo Rash 6 Mb; FDD/32 Mb/mouse за 80 у.а. Т.: 282-72-85, (8-0297) 52-14-65

**ПРАЦА**

**Надрукую радавод** (беларуская, расейская, наркамаўка, тарашкевіца). Augen1975@mail.ru

## Курсы карэктараў

Запрашаем усіх, хто прайшоў тэставаньне пасьпяхова, на папярэдняе сумоўе, паводле вынікаў якога будзе фармавацца навучальная група. Сумоўе адбудзецца ў Беларускім ПЭН-Цэнтры (вул.Казлова 7-101) у чацьвер, 17 красавіка, з 16-й да 19-й гадзіны. Пра вынікі тэстаў можна будзе даведацца праз тэл. 288-14-61. Адначасова Вам можна будзе выбраць больш дакладны час для сумоўя.

## Tertio Millennio on the Free Society

Інстытут «Tertio Millennio» 1—19 ліпеня ладзіць у Кракаве летнюю школу «Tertio Millennio on the Free Society». Да ўдзелу ў ёй запрашаюцца студэнты й асьпіранты зь Сярэдня-Ўсходняй Эўропы і ЗША. У праграме — лекцыі рэлігійных і палітычных дзеячоў Польшчы й ЗША па праблемах грамадзянскае супольнасьці. Працоўная мова — ангельская. Жытло, харчаваньне, экскурсіі ў часе школы аплачваюць арганізатары. Дарога да Кракава — за свой кошт. Заявы (па-ангельску) накіроўвайце на адрас: Dominikańska 3/13, 31-043 Kraków, Польшча. Дадатковая інфармацыя па т.: (+4812) 423-11-75; факс (+4812) 429-10-42, e-mail: instytut@tertio.krakow.pl.

Разам з заявай трэба даслаць зьвесткі пра сябе і невялікае фота.

# Танкі «Дзюбелю»



УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

**Паміж сэрыямі мэтал-акцыі, 17 красавіка, у «Рэактары» зайграе «Нэйра Дзюбель».** Канцэрт будзе цягнуцца дзьве з паловай гадзіны і складацца з старых гітоў каманды. Але Аляксандар Кулінковіч абяцае прэзэнтаваць і сёе-тое з новай беларускамоўнай праграмы (яе папярэдняя назва — «Танкі»). Яшчэ адна навінка — некаторыя песьні «Дзюбелю» аздобіць дуда. Цэны тыя ж, што і на мэталічныя канцэрты.

### Мэталеры, у «Рэактар»!

**13 і 20 красавіка** ў клюбе «Рэактар» зьбяруцца найлепшыя сілы айчыннай мэталёвай музыкі. Нагода — выданьне кампіляцыі «Hard Life — Heavy Music-2». Працавалі над укладаньнем праграмы цягам двух гадоў. З 50 дасланых трэкаў у альбом увайшлі толькі 19.

**13 красавіка** зайграюць менскія гурты «Morbid Victory», «Aquamorta», «Deadmarsh», «Arizona», а таксама «The Regent» з Гомелю — праект Лэсьлі «Ножыка», былога франтмэна культавых «Gods Tower».

**20 красавіка** будуць дамінаваць гурты зь іншых гарадоў — «Soncavarot» (Барысаў), «Euthanasia», «Apocryphal» (абодва з Рэчыцы), «Straight Land» (Бабруйск), «Твар» (Горадня), Менск будуць прадстаўляць «Трыяда», «Imprudence» і «Зьніч». Цьвіком канцэрту будзе прэзэнтацыя песьні ад «Vicious Crusade». Яна, як і «Euthanasia», упершыню засьпявае па-беларуску. «Deadmarsh», «Зьніч» маюць прэзэнтаваць песьні з новых альбомаў, што выйдуць пры канцы красавіка.

Пачатак канцэртаў у 18.00. Цана квітка на кожны — пры папярэднім продажы 6500 (танцпол), 8000 (месца за столікам), у дзень канцэрту 7500 (танцпол). Той, хто нападае абедзьве часткі прэзэнтацыі, атрымае падарунак — адзін з кампакт-дыскаў, выдадзеных BMA-group.

## ЖАРТЫ

— Сёньня нават маладыя дзяўчаты ведаюць, што такое любоў, — уздыхае бабулька.

— Але пасьля шлюбу забываюць, — пацяшае яе ўнучак.

* * *

Унучка пытае бабулю:

— Ці памятаеш мужчыну, які цябе ўпершыню пацалаваў?

— Даражэнькая, я ўжо нават ня помню апошняга.

**«Ніва»**

**Вытрымкі з алімпіядных працаў па беларускай мове**

**Алег Лойка** не надзяляе тварам ворагаў, толькі рукой. А яна ня можа разважаць без галавы.

**Тут постаць аўтара** без прыкрыцьця, у адзежы Адама, раскрываецца ў сваёй любові да роднага краю, называючы яго любай Радзімай: кутком для вечнага прыстанку.

**І спадзяюся,** што аднойчы зямлю Беларусі акіне вока гуманіста. А пакуль…

**Нам ёсьць чым** ганарыцца, нам ёсьць пра што пісаць. Мы сапраўды «дзеці дубоў, іх мудрай веснасьці».

**Даслала Віялета Пачкоўская**

## ХУТКАЯ ДАПАМОГА



## Вайна і патэнцыя

Расейская прэса паведаміла, што вайна ў Іраку кепска ўплывае на патэнцыю. Колькасьць пацыентаў у сэксапатолягаў і псыхатэрапэўтаў значна ўзрасла. Наглядзеўшыся вайсковых рэпартажаў, людзі атрымліваюць полавыя і псыхічныя разладжаньні. А вось галоўны сэксапатоляг Міністэрства аховы здароўя Беларусі Зьміцер Капусьцін кажа, што за апошнія два тыдні колькасьць зваротаў да беларускіх сэксолягаў не ўзрасла: «На нашых грамадзянаў вайна ў Іраку ніяк не ўплывае». Тое самае пацьвердзіла і загадчыца 1-га аддзяленьня гарадзкога цэнтру пагранічных станаў Сьвятлана Цурко.

**АШ**

## КОНКУРС «НН»

**Ч**ароўную **П**ані/**А**ню **Ж**ахае **З**ара **Б**арвістасьцю **С**онечных **Ф**арбаў.

**Ч**арот **П**акліча/**А**жыве, **Ж**уравель **З**акурлыча — **Б**алота **С**праўляе **Ф**эст.

**Уладзімер Дарагуж, Чэрвень**

**Ч**убаты (**А**)**П**анас **Ж**анаты **З** **Б**ылой **С**уседкай **Ф**эліцатай.

**С.Шыманоўскі**

У Магілёўскім унівэрсытэце штогод ладзіцца конкурс «Найлепшы будучы настаўнік». У 1997 г. мяне ўключылі ў журы, і ў якасьці хатняга заданьня я прапанаваў удзельнікам тое, што вы прапануеце цяпер. Вось два варыянты, якія журы палічыла найлепшымі:

**Ч**ароўныя **А**рыі/**П**есьні **Ж**аваронка **З**амінаюць **Б**адзёраму **С**кладаньню **Ф**ормул.

**Алесь Капёнкін**

**Ч**алавек **А**бірае **Ж**ыцьцё, **З**агадзя **Б**ачачы **С**вой **Ф**інал.

**Сяргей Кастрыца**

Дзе цяпер тыя студэнты, я ўжо ня ведаю. Але, магчыма, яны самі адгукнуцца, прачытаўшы свае прозьвішчы ў газэце.

**Міхась Булавацкі, Магілёў**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Баршчэўскі Лявон. Літаратура ад старажытнасьці да пачатку эпохі рамантызму.** Папулярныя нарысы. Менск, «Сэр-Віт», 2003. Наклад 3000 ас.

**Гарэцкі М. Прысады жыцьця:** Апавяданьні, аповесьці / Уклад. Т.Голуб. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 479 с.

У кнігу выбранага Максіма Гарэцкага ўвайшлі найбольш вядомыя творы клясыка, акрамя аповесьці «Дзьве душы». Каштуе блізу 6000 руб.

**Купала Янка. Збор твораў:** У 9 т. Т.9. Кн.1. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 686 с.

Набліжаецца да завяршэньня выданьне поўнага збору твораў Я.Купалы. Першая кніга 9-га, апошняга, тому зьмяшчае пераклады, ліставаньне Купалы. Тут друкуецца і «Расейска-беларускі слоўнік», падрыхтаваны ў 1922 г. Тэрміналягічнай камісіяй Інбелкульту, у склад якой уваходзілі І.Луцэвіч, К.Міцкевіч, М.Байкоў, С.Некрашэвіч ды інш. Слоўнік адлюстроўвае тэрміналёгію, датычную практыкі й тэорыі літаратурнага мастацтва. Аўтары выяўна імкнуліся да пурызму. Цана каля 4000 руб.

**Пазьняк З. Новае стагодзьдзе**. — Вільня—Варшава, 2002. — 108 с.: іл. Наклад 1200 ас.

Прызначаная для шырокага кола чытачоў, кніга мае выразны папулярна-асьветны характар (гл. рэцэнзію ў №8). Цікава, што макет вокладкі й падбор фота для ілюстраваньня рабіў сам аўтар.

**Палітычная сфера.** Навуковы часопіс. №2, сьнежань 2002. — Менск. — 100 с. Наклад 150 ас.

Саліднага ўзроўню часопіс, анансаваны як паўгадавік. Рэдактарам выступае Андрэй Казакевіч. Сярод матэрыялаў другога нумару — гутарка з Уладзімерам Мацкевічам, артыкулы Аксаны Гразновай пра крыніцы фінансаваньня палітычных партый, Андрэя Ягорава пра палітычны досьвед сэрбскага «Отпару». Побач друкуецца інтрыгоўны дакумэнт — «отпараўская» «Інструкцыя па працы з актывістамі». Асобныя падборкі прысьвечаныя філёзафу Рычарду Рорці, Малдове, праблемам тэрарызму і лібэральнага таталітарызму. Некаторыя артыкулы часопісу публікуюцца па-расейску. Часопіс паўстаў у коле дасьледчыкаў БДУ. Кантакты праз электронную пошту: political_sphere@yahoo.com.

**Шарая О. Ценностно-нормативная природа почитания предков**. — Менск: Тэхналёгія, 2002. — 249 с.

У манаграфіі падрабязна аналізуюцца праявы культу продкаў у духоўным жыцьці ўсходніх славянаў. Пытайцеся манаграфію ў «Акадэмкнізе».

**Падрыхтавала Тацяна Вабішчэвіч**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Андрэю А. з Гомелю.** Ваш тэкст пра Гомель шматслоўны, вялікая частка выкладзеных фактаў перапісаная з падручнікаў і даведнікаў. Асабістыя ўражаньні павярхоўныя. Няма сэнсу распавядаць, што вакзал у Гомелі — «невялічкі трохпавярховы будынак у клясычнай савецкай манеры пачатку 50-х». Той, хто прыедзе, сам адразу гэта пабачыць. Калі хочаце папулярызаваць свой горад, пішыце нам паведамленьні пра сёньняшняе жыцьцё гомельцаў.

**Аляксандру М-му зь Віцебску.** У Вас выйшаў сапраўдны літаратурны эцюд. «НН», на жаль, такога кшталту твораў цяпер не друкуе. Перашліце яго мо ў якую іншую газэту — «Народнае слова», «Витебский курьер», «ЛіМ».

**Алегу А. зь Менску**. Не дзяліце сьвядомых беларусаў, памнажайце іх.

**Віктару Я. зь Менску.** Дзякуй за добрыя словы. Меркаваньні і ацэнкі перадамо аўтарам.

**Глебу Я. зь Менску.** ЗША выгадна, каб Лукашэнка зрабіўся прэзыдэнтам РФ, бо будзе нагода распачаць з Расеяй вайну? Сумнеўна. Дый беларускай пазыцыі ў артыкуле не відаць: пішаце пра інтарэсы ЗША, Расеі, а на самае галоўнае забыліся. Другі матэрыял, «Ржавые грабли оппозиции», вытрыманы ў зьняважлівым тоне. Унікайце такога.

## Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ____________________

Імя і прозьвішча ____________________

Адрас, тэлефон ____________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
выпускны рэдактар — Сяргей Ёрш
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, (0296) 13-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.
Наклад 3726.
Нумар падпісаны ў друк 9.04.2003.
Замова № 1918.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а